# vaśminoh

# Базавае даследаванне адукацыі Беларусі ў межах праекта «Васьміног»

# Уводзіны

**Базавае даследаванне праведзена ў межах праекта «Васьміног» і ўяўляе сабой серыю аналітычных матэрыялаў, падрыхтаваных на аснове шасці даследаванняў у наступных тэмах:**

Аналіз сектаральных даследаванняў сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь 2020–2023 гг. (I);

Аналіз афіцыйных праграмных дакументаў 2020–2023 гг. (II);

Праекты рэформаў і практычныя змены ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь з верасня 2020 г. па ліпень 2023 г.: паміж афіцыйным і неафіцыйным дыскурсамі (III–IV);

Аналіз нефармальных (альтэрнатыўных) адукацыйных арганізацый і ініцыятыў, якія з'явіліся з 2020 г. у краіне і за яе межамі (V);

Аналіз матэрыялаў публічных мерапрыемстваў (канферэнцыі, дыскусіі, прапановы актывістаў, экспертаў, рэфарматараў і іншых актараў адукацыі), прысвечаных рэформам сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь (VI).

Структура дакумента адлюстроўвае яго тэматычнае напаўненне і дзеліцца на шэсць частак, а таксама мае ўвядзенне і заключэнне. У заключэнні аўтары робяць агульныя высновы на падставе ўсіх праведзеных даследаванняў.

# Змест

**Уводзіны**

**Частка I**

Аналіз сектаральных даследаванняў сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь 2020–2023 гг.

**Частка II**

Аналіз афіцыйных праграмных дакументаў 2020–2023 гг.

**Часткі III–IV**

Праекты рэформаў і практычныя змены ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь з верасня 2020 г. па ліпень 2023 г.: паміж афіцыйным і неафіцыйным дыскурсамі

**Частка V**

Аналіз нефармальных (альтэрнатыўных) адукацыйных арганізацый і ініцыятыў, якія з'явіліся з 2020 г. у краіне і за яе межамі

**Частка VI**

Аналіз матэрыялаў публічных мерапрыемстваў (канферэнцыі, дыскусіі, прапановы актывістаў, экспертаў, рэфарматараў і іншых актараў адукацыі), прысвечаных рэформам сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь

**Высновы**

**10 найбольш цікавых і важных дадзеных**

# Частка I

## Аналіз сектаральных даследаванняў сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь 2020–2023 гг.

У Беларусі няма адзінай інстытуцыі, якая спецыялізавалася б непасрэдна на комплексных даследаваннях у адукацыі і мела б устойлівую рэпутацыю надзейнай крыніцы дадзеных. Дадзеныя, датычныя сістэмы адукацыі ў Беларусі, маюць недастаткова дакладны, імавернасны і фрагментарны характар. Адукацыйныя даследаванні праводзяцца рознымі актарамі: дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі, зарэгістраванымі ініцыятывамі і незалежнымі даследчыкамі. У гэтай частцы прыводзіцца агляд асноўных даследаванняў беларускай адукацыі за 2020–2023 гг.

## § 1. Актары і суб'екты. Хто даследуе беларускую адукацыю?

**Дзяржаўныя ўстановы.** У праекце бюджэту на адукацыю ў Беларусі штогод закладаюцца грошы на правядзенне прыкладных даследаванняў [1]. Напрыклад, у бюджэце на 2022 г. было закладзена 9,7 млн рублёў (каля 3,8 млн долараў паводле курсу на пачатак года). Аднак канкрэтныя даследчыя ўстановы і кірункі даследаванняў не былі пазначаны.

Асноўныя звесткі наконт стану беларускай *сярэдняй адукацыі* публікуюцца ў межах Рэспубліканскага маніторынгу кантролю ведаў [2] пры *Нацыянальным інстытуце адукацыі*. Напрыклад, аналізуюцца вынікі даследавання ведаў і кампетэнцый па чытанні і разуменні тэкстаў [3], матэматыцы [4], гісторыі, біялогіі і г. д. Гэтая ж установа была адказная за аналіз звестак PISA-2018 [5]. Пасля 2018 г. даследаванне PISA ў Беларусі было спынена, аднак у 2023 г. запланавалі Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі, якое пабудавана пераважна на метадычнай аснове папярэдняга даследавання PISA і даследуе чытацкую, матэматычную, прыродазнаўчую і фінансавую пісьменнасць вучняў [6].

Часткова аналітыку пра кампетэнцыі *выпускнікоў* публікуе Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў на падставе вынікаў аналізу цэнтралізаванага экзамену [7].

Існуе некалькі часопісаў, якія публікуюць дадзеныя пра адукацыю. Напрыклад, «Веснік адукацыі» [8], «Адукацыя і выхаванне», а таксама спецыялізаваныя прадметныя выданні, напрыклад, «Фізіка», «Пачатковая школа» і г. д., аднак даследчыя публікацыі ў іх – хутчэй выключэнне.

**Міжнародныя арганізацыі.** Пэўная колькасць даследаванняў і маніторынгаў праводзіцца міжнароднымі арганізацыямі: ЮНІСЭФ [9], ЮНЕСКА, Сусветны банк. Звычайна гэта аналітычныя дакументы ў межах больш шырокіх сацыяльных праектаў ці маніторынгаў (напрыклад, аналіз рэалізацыі мэтаў устойлівага развіцця). Можна вылучыць даследаванне Сусветнага банка наконт стану прафесійнай адукацыі ў Беларусі [10]. Прыкметны трэнд пасля 2020 г. – знікненне міжнародных даследчых праектаў.

**Thinktank'і.** Сярод некалькіх дзясяткаў беларускіх «фабрык думкі» [11] на адукацыі спецыялізуюцца адзінкі [12]. Для пераважнай большасці арганізацый даследаванні ў галіне адукацыі можна лічыць ускоснай дзейнасцю, калі адукацыя ўспрымаецца як сфера эканамічных ці палітычных інтарэсаў. Напрыклад:

- Цэнтр эканамічных даследаванняў BEROC [13] у 2019–2020 гг. праводзіў даследаванні пераважна ў галіне вышэйшай адукацыі (аналіз прадукцыйнасці ўніверсітэтаў, мадэль «прадпрымальніцкага ўніверсітэта») і эканомікі адукацыі (узаемасувязь даходаў сям'і і адукацыйнай мабільнасці).

- «EAST Center» аналізаваў рэакцыю дзяржавы на COVID-19 у 2021 г. [14].

- Цэнтр новых ідэй праводзіў даследаванне стаўлення да сістэмы адукацыі сярод пратэставых груп насельніцтва [15].

**Недзяржаўныя адукацыйныя ініцыятывы і арганізацыі.** Часткова даследаванні праводзяць арганізацыі і ініцыятывы, якія працуюць з адукацыяй.

Напрыклад, у межах праекта «Беларуская адукацыя на шляху перамен» быў падрыхтаваны шэраг аналітычных дакументаў пра навучанне на працягу жыцця, інклюзіўную адукацыю, дыгіталізацыю, адукацыйныя палітыкі [16]. Акрамя таго, праводзіліся эмпірычныя даследаванні ўвагі адукацыйных экспертаў да пэўных кірункаў рэформаў [17], мадэляў узаемадзеяння адукацыйных ініцыятыў паміж сабой [18]. Офіс па адукацыі для новай Беларусі прааналізаваў стан рэалізацыі Балонскай сістэмы ў вышэйшай адукацыі, а таксама распрацаваў прапановы для падрыхтоўкі рэформаў у кірунку дэідэалагізацыі і дэбюракратызацыі ўсіх ступеняў адукацыі [19]. На грамадскай платформе «Новая Беларусь. Рэформы дзеля людзей» дадзена дыягностыка праблем і прадстаўлены праекты рэформаў на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі Беларусі [20].

Даследаваннямі ў галіне вышэйшай адукацыі займаецца пераважна Грамадскі балонскі камітэт (ГБК), які да 2020 г. падрыхтаваў дзве «Белыя кнігі» пра еўрапейскія перспектывы развіцця вышэйшай адукацыі Беларусі [21], а таксама рабіў маніторынгі выканання Дарожнай карты Балонскага працэсу. Пасля 2020 г. інтэнсіўнасць даследчай дзейнасці ГБК прыпынілася. У 2022 г. былі падрыхтаваны аналітычныя матэрыялы (напрыклад, «Аналітычны дакумент аб выніках рэалізацыі задачы "Навучанне на працягу ўсяго жыцця і сацыяльнае вымярэнне вышэйшай адукацыі па выніках 2021 года"»).

IDSM у 2021 г. зладзіў кампанію «Рэфармуем адукацыю разам» [22], а ў 2022 г. правёў даследаванне на тэму «Рэфармаванне сістэмы адукацыі Беларусі ў напрамку пашырэння інстытуцыйнай аўтаноміі і развіцця самакіравання адукацыйных устаноў», а таксама падрыхтаваў карту рэформаў беларускай адукацыі.

Арганізацыя «DVV international» ладзіла даследаванне дадатковай адукацыі дарослых, асаблівасцяў яе кіравання і фінансавання [23].

Беларускі Хельсінкскі Камітэт (БХК) у межах праекта «Нацыянальны індэкс правоў чалавека ў Беларусі» з 2019 г. штогод праводзіць маніторынг захавання права чалавека на адукацыю [24].

**Асобныя даследаванні**. Частка даследаванняў беларускай адукацыі праводзіцца асобнымі даследчыкамі з уласнай ініцыятывы або пры знешняй падтрымцы, аднак без афіліяцыі з пэўнымі арганізацыямі і ініцыятывамі. Сярод прыкладаў можна назваць такія даследаванні, як: «Маніторынг і ацэнка школьнай адукацыі ў Беларусі» [25]; высновы і парады па выніках PISA [26]; даследаванне праблем і радасцяў настаўнікаў [27]; фокус-група, прысвечаная праблемам кіравання беларускай адукацыяй; аналіз адукацыйных арганізацый у Беларусі [28]. Плюс такіх даследаванняў у тым, што яны скіраваны на рашэнне канкрэтнай задачы ці на аналіз пэўнай сітуацыі. Мінус – публікацыі атрымліваюцца разрозненыя, не сістэмныя, іх цяжка знайсці патэнцыйнаму чытачу.

# § 2. Што мы ведаем пра адукацыю?

**Сярэдняя адукацыя.** Даследаванне PISA-2018 [29] і дадзеныя рэспубліканскіх маніторынгаў, якія будуюцца на падставе міжнародных вымяральных інструментаў (напрыклад, PIRLS – маніторынг чытацкай пісьменнасці), сведчаць, што часцей за ўсё якасць беларускай адукацыі мае сярэдні ўзровень, не вышэйшы і не ніжэйшы за чаканні ад краіны з адпаведным узроўнем эканамічнага развіцця і выдаткаў на адукацыю.

Пры гэтым публічныя інтэрпрэтацыі вынікаў даследаванняў значна змяняюцца: ад высокай пазітыўнай ацэнкі з боку Міністэрства адукацыі – да рэзка негатыўных інтэрпрэтацый у недзяржаўных медыя. Асноўнымі хібамі можна назваць нізкую сфарміраванасць крытычнага мыслення, здольнасці самастойна разважаць і выказваць абгрунтаваныя думкі нават сярод высокаадукаваных вучняў.

**Недзяржаўныя адукацыйныя ініцыятывы і арганізацыі.** Часткова даследаванні праводзяць арганізацыі і ініцыятывы, якія працуюць з адукацыяй.

Калі казаць пра суб’ектыўнае стаўленне розных стэйкхолдараў, то можна прыйсці да ацэнак на ўзроўні «сярэдне», «здавальняюча». Напрыклад, пратэстава арыентаваная аўдыторыя, хаця і негатыўна ставіцца да сістэмы адукацыі

ў цэлым, ацэньвае асобныя ўзроўні адукацыі як здавальняючыя [30]. Такія ж нястрогія ацэнкі можна пабачыць і ў маніторынгу і ацэнцы школьнай адукацыі: нягледзячы на пэўныя дэфіцыты і незадаволенасць, большасць настаўнікаў і вучняў схіляюцца да сярэдніх паказчыкаў у сваіх ацэнках. Пры гэтым існуе запыт вучняў на большую свабоду ў пабудове адукацыйнага працэсу [31].

**Вышэйшая адукацыя.** Даследаванняў гэтага сектара ў перыяд 2020–2023 гг. значна менш як у параўнанні з папярэднім перыядам (да 2020 г.), так і з даследаваннямі сярэдняй адукацыі за 2020–2023 гг. Апошнія даследаванні ў галіне вышэйшай адукацыі канстатуюць падвышэнне рэпрэсій і акадэмічнай эміграцыі [32]. ГБК адсочвае рэпрэсіі ў галіне вышэйшай адукацыі і канстатуе значнае пагаршэнне акадэмічных свабод [33]. БХК фіксуе ў сваіх маніторынгах устойлівае пагаршэнне сітуацыі з правамі грамадзян на вышэйшую адукацыю паводле большасці параметраў і індыкатараў [34]. Негатыўную дынаміку гэтага сектара адукацыі можна адсачыць праз ускосныя фактары, напрыклад, праз зніжэнне прыёму студэнтаў і праз масавую эміграцыю абітурыентаў у іншыя краіны. Тым не менш, з'яўляюцца прапановы і аналітычныя дакументы, датычныя рэформаў сістэмы вышэйшай адукацыі [35].

**Прафесійная адукацыя** ў Беларусі – найменш даследаваная і мала вядомая шырокай грамадскасці. Вельмі рэдкія міжнародныя даследаванні вызначаюць неэфектыўнасць прафесійнай адукацыі, перш за ўсё ў плане суаднясення выдаткаваных рэсурсаў і росту эканамічнага і чалавечага капіталу як выніку адукацыі [36]. Асноўныя праблемы: гетаізацыя прафесійных каледжаў і ліцэяў, якія збіраюць найменш матываваных вучняў; адпаведна нізкая матывацыя выкладчыкаў; адрыў прафесійных праграм ад рэальнага працоўнага рынку; адсутнасць спецыялізаванага абсталявання і г. д. На платформе «Новая Беларусь. Рэформы дзеля людзей» прадстаўлены агляды агульнага стану, праблем і магчымых рашэнняў для прафесійна-тэхнічнай [37] і сярэдне-спецыяльнай [38] адукацыі. БХК штогод адсочвае пагаршэнне правоў на адукацыю ў гэтым сектары [39].

**Дашкольная і дадатковая адукацыя дарослых** застаюцца terra incognita ў даследчым сэнсе. Ёсць толькі некаторыя афіцыйныя дадзеныя, напрыклад, пра ахоп дашкольнай адукацыяй: у Беларусі ён адзін з найвышэйшых у рэгіёне, амаль 90 % [40] для дзяцей ва ўзросце 1–6 гадоў. Аднак якасць і эфекты адукацыі застаюцца недаследаванымі. У свабодным доступе ёсць матэрыялы Офіса па адукацыі для новай Беларусі наконт магчымых кірункаў рэфармавання гэтага адукацыйнага сектара [41], а таксама вынікі маніторынгу БХК [42].

**Дадатковая адукацыя дарослых** у Беларусі ахоплівае менш за 15 % людзей ва ўзросце 25–64 гадоў (у Еўропе і ЗША – каля 50–60 %), што можа сведчыць пра вельмі нізкую ўвагу да гэтага ўзроўню адукацыі як з боку дзяржавы, так і з боку недзяржаўных актараў.

# Такім чынам:

**Можна вылучыць наступныя слабыя месцы ў адукацыйных даследаваннях:**

● Няма звестак для аналізу дынамікі адукацыйнай сістэмы. Большасць даследаванняў мае разавы характар, лангітудныя метады распаўсюджаны мала.

● Ёсць пэўная колькасць маніторынгавых даследаванняў з боку дзяржаўных інстытуцый. Аднак зыходныя дадзеныя ў іх закрытыя (у адрозненне ад прынцыпаў міжнародных даследаванняў накшталт PISA), што не дазваляе знешнім даследчыкам і грамадзянскай супольнасці атрымліваць дадатковыя ідэі і вынікі з ужо сабраных ананімізаваных дадзеных.

● Правядзенне даследаванняў застаецца несістэмным. Востра не стае работ, якія б вызначаліся стратэгічнымі мэтамі, аналізавалі б з’явы рознабакова і з варыяцыйнай метадалогіяй, даводзілі б вынікі да шырокага кола грамадства і адсочвалі змены. Часткова толькі дадзеныя рэспубліканскіх маніторынгаў якасці адукацыі адпавядаюць гэтым крытэрыям, але яны пераважна застаюцца закрытымі і не заўсёды паўтараюцца.

● Існуе фактычная манаполія дзяржавы на даследаванні адукацыі, асабліва з колькаснай метадалогіяй, бо няма магчымасці збіраць рэпрэзентацыйныя выбаркі. Даследчыкі і навукоўцы сутыкаюцца з пераследам, што не дазваляе весці сталую даследчую дзейнасць.

● Асноўная частка даследаванняў прысвечана сярэдняй і вышэйшай адукацыі, пры гэтым некаторыя з сектараў (напрыклад, дашкольная, прафесійная і сярэдне-спецыяльная адукацыя, дадатковая адукацыя дарослых) амаль не трапляюць у сферу даследчыцкіх інтарэсаў.

● Няма аналітычных цэнтраў, якія б абагульнялі дадзеныя даследаванняў, адсочвалі новыя работы, ладзілі грамадскую дыскусію, вызначалі кірункі іншых навуковых даследаванняў і аб’ядноўвалі вакол сябе экспертызу беларускіх даследчыкаў, якія хацелі б працаваць у галіне адукацыі.

● Вынікі даследаванняў дрэнна прадстаўлены ў публічнай прасторы і ў спецыялізаваных выданнях.



# Частка II

## Аналіз афіцыйных праграмных дакументаў 2020–2023 гг.

За перыяд 2020–2023 гг. дзяржаўныя органы РБ прынялі некалькі дзясяткаў нарматыўных дакументаў у галіне адукацыі (гл. спіс нарматыўных дакументаў у Дадатку). Іх можна ўмоўна падзяліць на дзве групы: дакументы праграмнага (стратэгічнага) значэння і дакументы аператыўнага (кан' юнктурнага) значэння. У праграмных дакументах заяўляюцца мэты, прынцыпы, правы і свабоды грамадзян, у цэлым рэлевантныя аналагам сучасных дэмакратычных развітых краін свету. Выключэнне тут складаюць толькі некалькі тэмаў: рэгламентацыя вертыкальнай мадэлі кіравання сістэмай адукацыі, дэфіцыт інстытуцыйнай аўтаноміі, адсутнасць акадэмічных свабод і скажэнне ідэі гуманізацыі адукацыі да інструмента ідэалагічнага выхавання (індактрынацыі) насельніцтва.

У дакументах другой групы дамінуе трэнд узмацнення жорсткасці вертыкальнай, аўтарытарна-персаналісцкай сістэмы кіравання, захавання і павышэння бюджэтнага фінансавання, абмежавання інстытуцыйнай аўтаноміі, скасавання акадэмічных свабод, узмацнення ідэалагічнай індактрынацыі і жорсткасці дзяржаўнага кантролю не толькі на макра- (школа, каледж, універсітэт), але і на мікраўзроўні (праца выкладчыка ў аўдыторыі і настаўніка ў класе).

У цэнтры ўвагі гэтай часткі – дакументы першай групы. Сярод усіх праграмных дакументаў першай групы мы вылучаем два рамачныя, змест якіх мае найбольш інтэграцыйны, доўгатэрміновы характар: Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі РБ да 2030 года (2021) (далей – Канцэпцыя) і Кодэкс аб адукацыі (2022) (далей – Кодэкс). У той жа час у фокусе ўвагі застаюцца дакументы аператыўнага значэння, якія, як правіла, выконваюць ролю легалізацыі спантаннай практыкі прыняцця палітычных рашэнняў мінулым днём (rule by low). Такі падыход дазваляе пабачыць разрывы і кансэнсусныя пункты паміж двума тыпамі дакументаў. У гэтай частцы ўвага засяроджваецца на трох ключавых тэмах: стратэгічных мэтах і прынцыпах, сістэме фінансавання і сістэме кіравання.

## § 1. Стратэгічныя мэты і прынцыпы: дэкларацыя намераў vs рэальнасць

Першачарговая стратэгічная мэта Канцэпцыі заключаецца ў развіцці сістэмы адукацыі як аднаго з найважнейшых інстытутаў, што фарміруюць грамадства ведаў і ствараюць інавацыйную эканоміку. Адпаведна, развіццё сістэмы адукацыі мяркуе яе перманентнае абнаўленне: **«Грамадству патрэбныя адукаваныя, маральныя, прадпрымальныя і кампетэнтныя асобы, са здольнасцю самастойна прымаць адказныя рашэнні ў сітуацыі выбару, прагназуючы іх магчымыя наступствы, з уменнем выбіраць спосабы супрацоўніцтва. Яны мусяць вылучацца мабільнасцю, дынамізмам, канструктыўнасцю, мець развітое пачуццё адказнасці за свой лёс і лёс краіны».**

Канцэпцыя пазіцыянуе сістэму адукацыі РБ як частку сусветнай адукацыйнай прасторы і дэкларуе а) прытрымліванне сусветных тэндэнцый у сферы адукацыі і б) прадукцыйны абмен доследам (арт. 2). Аднак на ўзроўні практыкі і «тактычных» нарматыўных дакументаў апошнія тры гады ўлады метадычна ізалююць сябе з сусветнай адукацыйнай прасторы. Вось некалькі прыкладаў:

**па-першае**, Еўрапейская прастора вышэйшай адукацыі (ЕПВА) прыпыніла членства Беларусі ў Балонскім працэсе;

**па-другое**, Беларусь разарвала ў аднабаковым парадку пагадненне з Польшчай аб прызнанні раўназначнасці вышэйшай адукацыі і вучоных ступеняў у навуцы і мастацтве (Паст. Саўміна РБ 25.10.2022 № 728);

**па-трэцяе**, у Беларусі ўнеслі змены ў закон «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», што адмяняюць адтэрміноўку ад службы ў войску для беларусаў, якія навучаюцца за мяжой (15.05.2023 № 268-З).

Варта адзначыць, што колькасць навучэнцаў па накіраванні беларускіх дзяржаўных органаў у рамках дзяржаўных праграм нязначная (напрыклад, у 2011–2015 гг. гэта былі 20 выпускнікоў (0,03 % ад усіх) (Белая кніга, арт. 260). Штогод не ў рамках дзяржаўных праграм на навучанне за мяжу выязджаюць не менш за 4000 чалавек. Спробы кампенсаваць самаізаляцыю ад развітых дэмакратычных краін супрацоўніцтвам з экзатычнымі краінамі Афрыкі маюць сімвалічны характар (у ВНУ Беларусі вучацца 11 грамадзян Зімбабвэ) і не адпавядаюць заяўленым стратэгічным мэтам.

Галоўны бенефіцыяр цяперашняй ізаляцыі Беларусі – Расійская Федэрацыя. Згодна з дадзенымі Рассупрацоўніцтва, колькасць месцаў паводле квоты ўрада РФ за кошт бюджэту для беларусаў павялічылася з 73 у 2019 г. да 1300 у 2023 г. (яшчэ каля 1000 чалавек вучацца платна). Станам на сакавік 2023 г. у ВНУ РФ ужо вучацца больш за 12,5 тыс. грамадзян і грамадзянак Беларусі.

Канцэпцыя і Кодэкс дэкларуюць таксама адпаведнасць мэтам устойлівага развіцця ААН, напрыклад, мэце 4 – навучанню на працягу ўсяго жыцця для ўсіх (арт. 2). Яшчэ адна з гэтых мэтаў – гуманізацыя і гуманітарызацыя адукацыі. У сваю чаргу, гуманітарызацыя разумеецца ў праграмных дакументах як адзінства адукацыйнай і выхаваўчай практыкі: *«Яшчэ адна з тэндэнцый развіцця замежнай адукацыі – неадлучнасць навучання ад выхавання. Характэрнымі рысамі такой адукацыі з'яўляюцца гуманітарызацыя, закліканая фарміраваць духоўнасць, культуру, цэласнае развіццё ўсіх бакоў асобы…»*

Аднак на практыцы выхаванне разумеецца як працэс індактрынацыі таталітарнай дзяржаўнай ідэалогіі. Выхаванне ажыццяўляецца ў адукацыйных установах усіх узроўняў (ад дашкольнага да вышэйшага) і знаходзіць сваё заканадаўчае замацаванне ў ключавых праграмных дакументах – Кодэксе, Канцэпцыі, а таксама ў Праграме патрыятычнага выхавання насельніцтва РБ на 2022–2025 гг. (Паст. Саўміна РБ № 773 ад 29.11.2021). Так, у новай рэдакцыі Кодэкса першачарговай задачай выхавання называецца «*фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі*» (арт. 17, п. 2.1). Паколькі дзяржава ў такім вызначэнні цалкам дамінуе над грамадствам і ажыццяўляе абсалютны кантроль над жыццём і дзейнасцю грамадзян, зацвярджэнне адзінства інтарэсаў мае на ўвазе поўнае падпарадкаванне інтарэсаў грамадзян інтарэсам дзяржаўнай машыны.

Для рэалізацыі гэтых мэтаў і задач быў створаны спецыяльны орган – Рэспубліканская міжведамасная каардынацыйная рада па патрыятычным выхаванні насельніцтва (гл. Паст. Саўміна РБ № 773 ад 29.12.2021).

## § 2. Сістэма кіравання

Са зместу Кодэкса і Канцэпцыі вынікае, што адна з першачарговых задач дзяржаўнай палітыкі – зафіксаваць безумоўнае дамінаванне дзяржаўнага кіравання над грамадскім (гл. Канцэпцыя, разд. 3; Кодэкс, арт. 2, п. 1.9). Сама сістэма кіравання мае вертыкальны персаналісцкі характар. У новай рэдакцыі Кодэкса адсутнічае паняцце аўтаноміі і, адпаведна, увесь комплекс звязаных з ёй прававых нормаў.

Дэкларуецца, што сістэма кіравання «*будуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання*» (Кодэкс, арт. 21, п. 1). Аднак, раду – асноўны орган самакіравання ўсіх адукацыйных устаноў Беларусі – «*узначальвае кіраўнік установы адукацыі*» (Кодэкс, арт. 24, п. 4). Уся кіраўнічая вертыкаль завяршаецца асобай прэзідэнта РБ, ён мае такую паўнату ўлады і кантролю над сістэмай адукацыі, якая можа быць выказана наступнай фармулёўкай, часта ўжыванай у Кодэксе: «*калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь*».

## § 3. Сістэма фінансавання

У асноўных праграмных дакументах дэкларуецца роўнае забеспячэнне правоў грамадзян на атрыманне адукацыі на бюджэтнай і платнай аснове. Аднак у рэальнасці гэтае права рэалізавана на мінімальным узроўні. Масавае закрыццё з палітычных матываў прыватных школ у 2021–2022 гг. вызначыла абсалютнае дамінаванне дзяржаўнага сектара ў агульнай сярэдняй адукацыі. У 2021–2022 гг. з 1,07 млн навучэнцаў толькі 2,7 тыс. (0,25 %) вучыліся ў прыватных школах. Усе ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі – дзяржаўныя. На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 13 прыватных установах (5,8 % ад іх агульнай колькасці) вучацца 10,3 тыс. чалавек (9 %). У вышэйшай адукацыі доля прыватных устаноў – 17,6 %, а доля навучэнцаў – 6,3 %. У той жа час дзяржаўны сектар вышэйшай адукацыі значна камерцыялізаваны: каля 50 % студэнтаў вучацца платна. У мэтах узмацнення кантролю кар’ерных траекторый выпускнікоў школ і ВНУ краіны за мінулыя тры гады істотна павялічана доля мэтавікаў і бюджэтнікаў. На некаторых медыцынскіх спецыяльнасцях доля мэтавікаў дасягае 80 %, на сельскагаспадарчых – 70 %.

## Дадатак: Спіс нарматыўных дакументаў

- Государственная программа «Социальная защита» на 2021–2025 годы (утверждена Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21.12.2020 № 748)
- Государственная программа «Рынок труда и содействие занятости» на 2021–2025 годы (утверждена Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30.12.2020 № 777)
- Государственная программа «Образование и молодежная политика» на 2021–2025 годы (утверждена Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 29.012021 № 57)
- Кодекс об образовании Республики Беларусь (2022)
- Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года (2021)
- Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 года (одобрена Президиумом Совета Министров Республики Беларусь, протокол заседания от 2.05.2017 № 10)
- О Государственной программе «Образование и молодежная политика» на 2021–2025 годы
- Образование в Республике Беларусь. Буклет. Минск, 2021
- Образование в Республике Беларусь. Статистический сборник. Минск, 2019
- Образование в Республике Беларусь. 2019–2020 учебный год. Минск, 2019
- Образование в Республике Беларусь на начало 2022/2023 учебного года. Буклет
- Программа деятельности Правительства Республики Беларусь на период до 2025 года (утверждена Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 24.12.2020 № 758)
- Программа патриотического воспитания населения Республики Беларусь на 2022–2025 годы (утверждена Постановлением Совета Министров РБ № 773 от 29.12.2021)
- Программа социально-экономического развития Республики Беларусь на 2021–2025 годы (утверждена Указом Президента Республики Беларусь от 29.07.2021 № 292)
- Стратегия развития государственной молодежной политики Республики Беларусь до 2030 года (утверждена Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 19.06.2021 № 349)
- Сводный отчет о реализации государственных программ в 2021 году

[1] Праект бюджэту на 2022 г.

[2] Старонка Рэспубліканскага маніторынгу кантролю ведаў.

[3] Вынікі маніторынгу па чытанні і разуменні тэкстаў.

[4] Вынікі маніторынгу па матэматыцы.

[5] Міжнароднае параўнальнае даследаванне якасці адукацыі (справаздача пра Беларусь).

[6] Апісанне Нацыянальнага маніторынгу кантролю ведаў.

[7] Публікацыі РІКВ.

[8] Часопісы: «Веснік Адукацыі», «Адукацыя і Выхаванне».

[9] Даследчыя публікацыі ЮНІСЭФ.

[10] Публікацыя «Diagnostic and Policy Options for the Vocational Education and Training System in Belarus».

[11] Пералічаны на старонцы thinktanks.by.

[12] Напрыклад, Грамадскі балонскі камітэт: https://bolognaby.org.

[13] Публікацыі BEROC, датычныя адукацыі.

[14] Даследаванне «Belarus's response to Covid-19 in the education sector».

[15] Даследаванне «Як ацэньваюць сістэму адукацыі Беларусі пратэставыя беларусы».

[16] Рэзюмэ аналітычных дакументаў, прысвечаных: адукацыі на працягу жыцця, інклюзіўнай адукацыі, дыгіталізацыі, адукацыйным палітыкам.

[17] Рэзюмэ завочнага экспертнага абмеркавання рэформаў у адукацыі.

[18] Рэзюмэ аналітычнага дакумента пра ўзаемадзеянне адукацыйных ініцыятыў.

[19] Спасылка на аналітычныя дакументы.

[20] Гл. тут.

[21] Белая кніга 2013. Реформирование высшей школы Беларуси в соответствии с целями, ценностями и основными направлениями политики Европейского пространства высшего образования. Мн., 2013; Белая книга 2018. Европейские перспективы беларуского высшего образования. Вильнюс, 2018.

[22] Аналітычныя дакументы гл. тут.

[23] Даследаванне дадатковай адукацыі дарослых.

[24] Дадзеныя маніторынгаў за 2019–2021 гг. выкладзены тут.

[25] Амялюсік В. Маніторынг і ацэнка школьнай адукацыі ў Беларусі, 2021.

[26] Высновы і парады па выніках PISA-2018.

[27] Справаздача для адукатараў па выніках даследавання праблем і радасцяў.

[28] Даследаванне адукацыйных арганізацый і праектаў.

[29] PISA-2018. Belarus country report.

[30] З матэрыялаў даследавання «Як ацэньваюць сістэму адукацыі Беларусі пратэставыя беларусы».

[31] Інфаграфіка па выніках маніторынгу.

[32] Даследаванне RADA «Што думае беларуская моладзь?».

[33] Гл. апошнія дадзеныя «Academic freedom Index» адносна Беларусі на сайце ГБК.

[34] Гл. тут.

[35] Напрыклад, аналітычныя дакументы Офіса па адукацыі, а таксама матэрыялы Інстытута развіцця і сацыяльнага рынку для Беларусі і Усходняй Еўропы.

[36] Паводле «Diagnostic and Policy Options for the Vocational Education and Training System in Belarus».

[37] Агляд прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

[38] Агляд сярэдне-спецыяльнай адукацыі.

[39] Гл. тут.

[40] Статыстыка Міністэрства адукацыі Беларусі.

[41] Аналітычны дакумент «Рэфармаванне дашкольнай адукацыі» (гл. адпаведныя раздзелы ў дакументах «Дебюрократизация системы образования Республики Беларусь» и «Деидеологизация системы образования Республики Беларусь»).

[42] Гл. тут.



# Часткі III–IV

## Праекты рэформаў і практычныя змены ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь з верасня 2020 г. па ліпень 2023 г.: паміж афіцыйным і неафіцыйным дыскурсамі

У гэтым дакуменце аналізуюцца ключавыя пункты дзяржаўнай палітыкі ў рэфармаванні сістэмы адукацыі, а таксама праекты рэформаў ад грамадзянскіх суполак, аб’яднанняў і партый, разглядаюцца іх супадзенні і разыходжанні. Такі падыход дазваляе высветліць тыя моманты, дзе можна спадзявацца на агульнанацыянальны кансэнсус, а таксама найбольш спрэчныя пытанні («шэрыя зоны»), пра якія няма кансэнсусу не толькі паміж дзяржаўным і недзяржаўным дыскурсам (a), але і сярод прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў (b).

## 1. Агляд афіцыйнага дыскурсу

Нягледзячы на т. зв. сістэмна-матрычны падыход да рэформаў і дамінантную ў сістэме адукацыі Беларусі вертыкальную мадэль кіравання, у беларускім афіцыйным дыскурсе можна вылучыць тры адносна аўтаномныя вымярэнні (узроўні), звязаныя з дэклараваннем, праектаваннем і рэалізацыяй рэформаў у сферы адукацыі:

1. узровень палітычных дэкларацый намераў, якія сфармуляваны ў праграмных дакументах (Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года (2021), Кодэкс аб адукацыі (2022)) і агучаны полісімейкерамі ў сферы адукацыі (напрыклад, «заданне» А. Лукашэнкі Міністэрству адукацыі аб кірунках і тэрмінах завяршэння рэформаў [1]);
2. узровень праектных і аператыўных нарматыўных дакументаў (палажэнні, указы і пастановы Міністэрства адукацыі);
3. узровень практычных змен у сістэме адукацыі пад ціскам абставін (як правіла, знешніх – напрыклад, у сувязі з пачаткам вайны ва Украіне і з прыпыненнем удзелу РБ у Балонскім працэсе).

Кожны з гэтых узроўняў мае сваю ступень рацыянальнасці, ажыццяўляльнасці і эфектыўнасці ўздзеяння.

Аналіз дакументаў першага ўзроўню быў дадзены намі вышэй (гл. часткі I–II). У гэтых частках прадметам аналізу стане шэраг праектных і аператыўных нарматыўных дакументаў, прынятых з верасня 2020 г. па верасень 2023 г., а таксама практычных рашэнняў і эфектаў ціску знешніх абставін на змены ў сістэме адукацыі і на правядзенне рэформаў [2].

Найбольш значнымі абставінамі непераадольнай сілы, якія аказалі вызначальны ўплыў на сістэму адукацыі Беларусі, сталі дзве тэндэнцыі: 1) тэндэнцыя ізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ад адукацыйных прастор развітых краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі сістэмы адукацыі РБ; 2) тэндэнцыя інтэграцыі і асіміляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ў адукацыйную прастору РФ.

Акрамя таго, усе рэфармацыйныя праекты і сапраўдныя змены, ажыццёўленыя ў сістэме адукацыі ў цікавы для нас перыяд з верасня 2020 г. па ліпень 2023 г., можна падзяліць на дзве вялікія групы:

1. агульныя (сістэмныя), гэта значыць, датычныя ўсіх узроўняў адукацыі;
2. спецыяльныя (адрасныя), гэта значыць, праведзеныя на тым ці іншым узроўні адукацыі.

## § 1. Агульны сістэмны ўзровень

**Па-першае, гэта тэндэнцыя ізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ад адукацыйных прастор развітых краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі.** Найбольш відавочнымі сімптомамі з'яўляюцца адыход з Беларусі еўрапейскіх адукацыйных інстытуцый і прадстаўніцтваў (прыклад – Гётэ-Інстытут і DAAD); выключэнне Беларусі ў аднабаковым парадку з Міжнароднай праграмы ацэнкі адукацыйных дасягненняў вучняў школ (PISA); выключэнне Беларусі з моладзевага прафесійнага руху «WorldSkills International»/«WorldSkills Belarus»; рашэнне Назіральнай групы Балонскага працэсу (BFUG) прыпыніць прадстаўніцтва Беларусі ў ЕПВА; прыпыненне міжнародных праграм – фінансавай падтрымкі рэформаў адукацыі ў Беларусі (прыклад праграма Сусветнага банка «Праект мадэрнізацыі вышэйшай адукацыі Беларусі 2020–2025» на 109 млн долараў); абмежаванне магчымасцяў і падтрымкі, неабходных для паступлення беларускіх студэнтак і студэнтаў у ВНУ заходніх краін (перш за ўсё ў ВНУ найбліжэйшых суседак – Польшчы і Літвы).

**Па-другое, гэта тэндэнцыя інтэграцыі і асіміляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ў адукацыйную прастору РФ.** Гэтаму садзейнічае праактыўная адукацыйная палітыка РФ, накіраваная на фінансавую, тэхнічную і інфраструктурную падтрымку сістэмы адукацыі Беларусі (на ўсіх узроўнях), яе сінхранізацыю і ўніфікацыю з расійскай сістэмай адукацыі, узмацненне акадэмічнай эміграцыі ў РФ беларускіх абітурыентаў, студэнтаў і выкладчыкаў.

**Па-трэцяе, на падставе Указа № 23 у Беларусі пашырылася сфера выкарыстання мэтавай падрыхтоўкі** для арганізацый, размешчаных не толькі ў малых населеных пунктах і на забруджаных тэрыторыях, але і ў іншых населеных пунктах, як на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (каледжаў), так і на ўзроўні вышэйшай адукацыі (універсітэтаў, акадэмій і інстытутаў).

**Па-чацвёртае, адбываецца ўзмацненне ідэалагічнага і вайскова-патрыятычнага складніка адукацыі ў РБ**. Так, Пастановай Міністэрства адукацыі ад 15.07.2021 [3] ва ўсіх установах адукацыі (уключна з яслямі-садамі, але за выключэннем пачатковых школ, вячэрніх школ, дапаможных школ, спецыялізаваных ліцэяў) была ўведзена пасада кіраўніка вайскова-патрыятычнага выхавання. У навучальныя праграмы ўсіх узроўняў адукацыі ўведзены курсы вайскова-патрыятычнага і ідэалагічнага зместу.

**Па-пятае, у новай рэдакцыі Кодэкса ўводзіцца паняцце інклюзіі** як аднаго з асноўных прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі.

**Па-шостае, у абноўленым Кодэксе дыстанцыйнае навучанне замацавана як самастойная форма атрымання адукацыі**, якая, аднак, не распаўсюджваецца на агульную сярэднюю адукацыю. Прадугледжваецца таксама, што адукацыйныя праграмы будуць рэалізоўваць з дапамогай сеткавых формаў узаемадзеяння паміж рознымі ўстановамі адукацыі ўнутры краіны.

**Па-сёмае, новая рэдакцыя Кодэкса дае магчымасць падлеткам, якія знаходзяцца ў СІЗА, прадоўжыць навучанне**, парадак чаго вызначаны асобным заканадаўчым актам.

## § 2. Спецыяльны ўзровень

### Дашкольная адукацыя (МСКА 0)

**Па-першае, у новай рэдакцыі Кодэкса з’явілася магчымасць атрымліваць дашкольную адукацыю дома.** «Аптымізаваны» віды ўстаноў дашкольнай адукацыі: калі ў мінулай рэдакцыі іх было шэсць, то ў новай засталіся толькі тры: дзіцячы сад, санаторны дзіцячы сад і дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці. Пры гэтым агульная колькасць устаноў дашкольнай адукацыі не змянілася.

**Па-другое, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам дадзены паўнамоцтвы змяняць нормы запаўняльнасці груп** пры наяўнасці аб’ектыўных абставін і станоўчага заключэння органаў і ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд.

**Па-трэцяе, Кодэкс легалізуе дадатковую адукацыю дзяцей у дзіцячым садку:** з’явіліся магчымасці для дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

### Агульная сярэдняя адукацыя (МСКА 1–3)

**Па-першае, на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі (МСКА 1–3) улады ўвялі шэраг дадатковых мераў узмацнення кантролю за «дысцыплінай і парадкам у навучальным працэсе»** (доступ ва ўстановы з турнікетамі і відэакамерамі, увядзенне школьнай формы).

**Па-другое, агульнае сістэмнае ўзмацненне ідэалагічнага і вайскова-патрыятычнага складніка на ўзроўні сярэдняй школы мела сваю спецыфіку.** Ужо з верасня 2021 г. у школах з’явілася новая пасада настаўніка (кіраўніка) вайскова-патрыятычнага выхавання (агулам уведзена каля 2000 ставак), ролю якіх выконвалі кадравыя вайскоўцы, гэта значыць, людзі, якія не маюць спецыяльнай педагагічнай адукацыі [6]. Акрамя гэтага, у навучальныя праграмы былі ўведзены дадатковыя ўрокі выхаваўча-патрыятычнага характару.

**Па-трэцяе, дэінтэрнацыяналізацыя і павышэнне залежнасці ад РФ стала адчувацца і на ўзроўні сярэдняй школы** (напрыклад, правядзенне тэсціравання па аналогіі з PISA, фінансаванне з боку РФ стварэння 150 інжынерна-інавацыйных класаў (STEM-класаў) у межах праграмы РОББО).

**Па-чацвёртае, новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі зрабіла абавязковым заканчэнне адзінаццаці класаў** (арт. 2) замест ранейшых дзевяці класаў [7].

**Па-пятае, узаконенае новым Кодэксам паняцце інклюзіі на ўзроўні сярэдняй школы мае на ўвазе павелічэнне тэрміну атрымання спецыяльнай адукацыі з 9 да 10 гадоў.**

**Па-шостае, увядзенне цэнтралізаванага экзамену для выпускнікоў школ 2023 г.** Гэтая мера была ўведзена дзеля спрашчэння працэдуры паступлення ў беларускія ВНУ, асабліва тэхнічнага профілю (замест чатырох ЦТ неабходна здаць толькі два ЦЭ і адно ЦТ), ва ўмовах дэмаграфічнай ямы і адтоку абітурыентаў у замежныя ВНУ. Пры правядзенні ЦЭ і ЦТ у 2023 г. змянілася структура і складанасць экзаменацыйных матэрыялаў: заданняў стала менш і яны сталі прасцейшымі (у тэстах не было заданняў алімпіяднага – павышанага – узроўню складанасці).

**Па-сёмае, у ліпені 2022 г. міністр адукацыі А. Іванец анансаваў распрацоўку новых метадычных указанняў** для ўсіх установ агульнай сярэдняй адукацыі, паводле якіх з 1 верасня 2022/2023 навучальнага года ў школы вяртаецца дапрофільная падрыхтоўка з восьмага класа.

**Па-восьмае, зніжаны ўзрост тых, хто паступае ў першы клас:** калі раней у школу бралі шасцігодак або тых, каму споўніцца шэсць гадоў да канца верасня, то цяпер уводзіцца магчымасць прымаць у парадку выключэння дзяцей, якім шэсць гадоў споўніцца да 31 снежня навучальнага года.

**Па-дзявятае, адноўлены Кодэкс узаконіў практыкаваную раней норму аб замацаванні мікрараёна за ўстановай адукацыі.** Школы будуць прымаць у першую чаргу дзяцей, якія пражываюць у гэтым мікрараёне, а астатніх – толькі калі будуць вольныя месцы.

**Па-дзясятае, адноўлены Кодэкс павялічыў працягласць навучальнага года: з 1 верасня да 31 жніўня** (а не да 31 траўня, як раней). У Мінадукацыі патлумачылі неабходнасць такой праўкі тым, што падчас летніх канікул у школах таксама ідзе адукацыйны працэс: працуюць летнія лагеры, праводзяцца мерапрыемствы і г. д.

**Па-адзінаццатае, уведзены шосты навучальны дзень.** Факультатывы ў школах можна будзе праводзіць у суботу. Раней гэта было магчыма толькі для вучняў старэйшых класаў, цяпер – з пятага класа.

**Па-дванаццатае, адноўлены Кодэкс змяніў умовы паступлення ў дзясятыя класы гімназій** (для іх уводзіцца конкурс).

**Па-трынаццатае, у выніку закрыцця прыватных школ летам і восенню 2022 г. фактычна быў знішчаны прыватны сектар агульнай сярэдняй адукацыі** (з ранейшых 30 прыватных школ у лістападзе 2022 г. да навучання прыступілі толькі 3) [9]. Гэтую падзею варта разумець як брутальную меру татальнага адзяржаўлення агульнай сярэдняй адукацыі.

## Узровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі (ПТА) і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (ССА) (МСКА 4–5)

**Па-першае, агульнасістэмная тэндэнцыя ізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ад міжнародных арганізацый і фондаў** знайшла сваю праяву на ўзроўні ПТА і ССА ў выключэнні Беларусі ў аднабаковым парадку з моладзевага прафесійнага руху «WorldSkills International»/«WorldSkills Belarus» (МСКА 4–5).

**Па-другое, ва ўмовах ізаляцыі і самаізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі полісімейкеры прафесійна-тэхнічнай адукацыі пераарыентуюць яе на расійскі і азіяцкі адукацыйныя рынкі** (усерасійская і азіяцкая алімпіяды прафесійнага майстэрства, канферэнцыі, праекты і фонды РФ і краін Азіі).

**Па-трэцяе, з 2023 г. уведзены новы класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый,** які «прыведзены ў адпаведнасць з актуальным сёння класіфікатарам відаў эканамічнай дзейнасці».

**Па-чацвёртае, з верасня 2022/2023 навучальнага года ўведзена адзіная сістэма каледжаў,** у якіх могуць рэалізоўвацца як праграмы ПТА, так і праграмы ССА. Гэтую меру можна разумець як інструмент інстытуцыйнай і зместавай (на ўзроўні праграм) уніфікацыі адукацыі ўзроўню МСКА 4–5.

**Па-пятае, зменшаны тэрмін атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі ў дзённай форме:** цяпер ён складае 6–12 месяцаў замест ранейшых 1–2 гадоў. Шэраг прафесій цяпер можна асвоіць менш чым за год. Гэтая мера ўскосна сведчыць пра зніжэнне прывабнасці ПТА на фоне вострага дэфіцыту кадраў тэхнічных прафесій на рынку працы РБ.

**Па-шостае, навучэнцы ПТА, якія сталі пераможцамі конкурсу прафесійнага майстэрства, могуць атрымаць вышэйшую адукацыю на льготных умовах**, а выпускнікі ССА могуць атрымаць вышэйшую адукацыю за скарочаны тэрмін (пераважна ў завочнай форме). Гэтая мера набліжае наяўную ў РБ архітэктуру адукацыі да архітэктуры ЕПВА, у рамках якой МСКА 4–5 разглядаецца як скарочаная практычна арыентаваная вышэйшая адукацыя.

**Па-сёмае, норма, якая з'явілася ў адноўленым Кодэксе і была звязана з рэалізацыяй адукацыйных праграм у сеткавай форме, знайшла сваю рэалізацыю на ўзроўні МСКА 4–5 у стварэнні рэсурсных цэнтраў** («цэнтраў кампетэнцый»), на базе якіх навучэнцы ўстаноў змогуць атрымаць навыкі эксплуатацыі сучаснага абсталявання, а таксама асвоіць найноўшыя тэхналогіі.

**Па-восьмае, пашыраны правы грамадзян РБ і іншаземцаў пры паступленні ва ўстановы ПТА:** атрымліваць ПТА маюць права беларусы незалежна ад месца жыхарства, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія стала пражываюць у Беларусі. Такая мера можа быць ускосным сведчаннем вострага дэфіцыту кадраў тэхнічных прафесій у краіне.

**Па-дзявятае, для дзяцей-сірот і асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія атрымалі прафесійную адукацыю, уводзіцца працаўладкаванне ў лік броні.** Гэтая мера разглядаецца рэгулятарам як інструмент дзяржаўнай падтрымкі сацыяльна неабароненых груп насельніцтва РБ [11].

## Узровень вышэйшай адукацыі (МСКА 6–8)

**Па-першае, тэндэнцыя ізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ад адукацыйных прастор развітых краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі** знайшла на ўзроўні вышэйшай адукацыі сваю выразную праяву ў рашэнні Назіральнай групы Балонскага працэсу (BFUG) аб прыпыненні прадстаўніцтва Беларусі ў ЕПВА. Знешні фактар ізаляцыі быў узмоцнены ўнутраным. У кастрычніку 2022 г. Беларусь разарвала ў аднабаковым парадку пагадненне з Польшчай аб прызнанні раўназначнасці вышэйшай адукацыі і вучоных ступеняў у навуцы і мастацтве [12]. У траўні 2023 г. у Беларусі ўнеслі змены ў Закон «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», што адмяняюць адтэрміноўку ад службы ў арміі для беларусаў, якія вучацца за мяжой [13].

**Па-другое, тэндэнцыя інтэграцыі і асіміляцыі вышэйшай адукацыі Беларусі ў адукацыйную прастору РФ была ўзмоцнена дзякуючы шэрагу знешніх і ўнутраных фактараў.** Прыпыненне ўдзелу РБ у Балонскім працэсе адбывалася сінхронна з РФ і пры медыйнай падтрымцы з боку расейскіх чыноўнікаў Міністэрства адукацыі і навукі. Прарасійская палітыка полісімейкераў у РБ зрабіла «сінхранізацыю» і інтэграцыю вышэйшай адукацыі РБ у адукацыйную прастору РФ безальтэрнатыўнай і непазбежнай.

**Па-трэцяе, пашырылася дзеянне і павялічылася працягласць мэтавага навучання.** Калі раней (арт. 84 Кодэкса-2011) адпрацоўванне пяці гадоў пасля мэтавай падрыхтоўкі распаўсюджвалася на першую прыступку вышэйшай адукацыі (бакалаўры), то цяпер (арт. 75 Кодэкса-2022) – і на спецыяльную вышэйшую адукацыю (магістры з бесперапынным цыклам адукацыі). З 2023 г. істотна павялічаны і працэнт бюджэтных месцаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі: для спецыялістаў сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў – да 70 % ад кантрольных лічбаў прыёму; медыцынскіх спецыяльнасцяў – да 80 %; іншых спецыяльнасцяў – да 60 %.

**Па-чацвёртае, зменены сістэма і парадак прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы (уведзены цэнтралізаваны экзамен).** На думку рэгулятара, гэтыя змяненні «мусяць прадухіліць адток абітурыентаў у сумежныя краіны, павысіць канкурэнтаздольнасць установ прафесійнай адукацыі рэспублікі і якасць адбору абітурыентаў».

**Па-пятае, з мэтай павышэння ўязной акадэмічнай міграцыі з РФ з 2022 г. даюцца льготы пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі РБ** асобам, якія здалі адзіны дзяржаўны экзамен у Расіі (пры паступленні на платную форму навучання).

**Па-шостае, агульнасістэмная тэндэнцыя ідэалагізацыі і мілітарызацыі мела сваю спецыфіку ў вышэйшай адукацыі.** Са снежня 2020 г. у ВНУ Беларусі ўведзена новая пасада «сакрэтнага» прарэктара «па бяспецы і кадрах» з шырокім колам абавязкаў. З 1 верасня 2022 г. у абавязковы блок сацыяльна-гуманітарных дысцыплін уведзены тры прадметы з выразным ідэалагічным складнікам: гісторыя беларускай дзяржаўнасці, сучасная палітэканомія і філасофія. З 2022 г. пачалі даваць ільготы пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі выпускнікам класаў спартыўна-педагагічнай і вайскова-патрыятычнай накіраванасці, а таксама дзецям вайскоўцаў, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія загінулі (памерлі) або сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў.

**Па-сёмае, камерцыялізуецца кантроль дысцыпліны ў ВНУ:** са студэнтаў, якія ігнаруюць навучальныя заняткі, а таксама за правядзенне паўторных заняткаў па-за групай і за ліквідацыю акадэмічнай запазычанасці можа спаганяцца дадатковая плата.

**Па-восьмае, пасля ўступлення ў сілу абноўленага Кодэкса аб адукацыі ў Беларусі з'яўляецца т. зв. спецыяльная вышэйшая адукацыя,** якая ўводзіцца для асобных тэхнічных і медыцынскіх спецыяльнасцяў.

## 2. Агляд неафіцыйнага дыскурсу

У гэтым раздзеле робіцца агляд праектаў рэформаў, якія прапаноўваліся неафіцыйнымі актарамі, іх асаблівасцяў, асноўнага зместу і перасячэнняў з дзяржаўнымі праграмамі. Праекты рэформаў аналізаваліся паводле наступных характарыстык:

- Фармат прад'яўлення: апублікаваныя тэксты, іншыя формы.
- Глыбіня распрацоўкі: сістэмныя ці асобныя змены, ахоп узроўняў адукацыі.
- Змест: ідэйныя падставы рэформаў, сутнасць прапаноў, суадносіны з дзяржаўнай палітыкай.

У базу агляду трапілі наступныя арганізацыі і ініцыятывы:

- Офіс па адукацыі для новай Беларусі [1].
- Прапановы, апублікаваныя на платформах грамадзянскага дыялогу: Банк ідэй [2], «Новая Беларусь» [3], «За Беларусь» [4].
- Прапановы грамадзянскіх і адукацыйных ініцыятыў і арганізацый («Беларуская адукацыя на шляху перамен», «ЕўраБеларусь»).
- Прапановы даследчых цэнтраў (IDSM, Грамадскі балонскі камітэт).

Праграмы палітычных партый (БНФ, «Грамада», «Зялёныя», БХД).

**Пры разглядзе былі зроблены наступныя папраўкі:**

- Выключэнне палітычных партый. Хаця ва ўсіх праграмах палітычных партый ёсць раздзелы пра адукацыю, яны звычайна былі распрацаваны да 2020 г. і застаюцца хутчэй дэкларацыйным бачаннем кірункаў развіцця адукацыі, чым канкрэтнымі праектамі рэформаў. З гэтай нагоды праграмы палітычных партый не разглядаліся ў гэтым дакуменце. Выключэннем можна лічыць праграму, якую прадставіла «Грамада» на грамадскай платформе «За Беларусь» ад імя супольнасці розных партый.
- Улік перасячэння актараў. Пры разглядзе праектаў рэформаў ёсць складанасць размежавання розных актараў і іх прапаноў. Часам прапановы асобных праектных ці даследчых груп могуць быць прадстаўлены на розных пляцоўках. Напрыклад, прапановы працоўнай групы IDSM пераважна размешчаны на сайце «Новая Беларусь», таму ў агляд трапіў толькі праект на сайце грамадскай платформы, бо старонка аналітычнага цэнтра недаступная. У межах іншых праектаў ёсць перасячэнні працоўных камандаў. Напрыклад, на сайце Офіса па адукацыі для новай Беларусі апублікаваны дакументы, адукацыя на шляху перамен» у межах супольнага праекта пры падтрымцы кансорцыума «ЕўраБеларусь», у іншых кантэкстах гэты праект выступае як асобны актар. У гэтым дакуменце «Беларуская адукацыя на шляху перамен» і Офіс па адукацыі размяжоўваюцца як актары, хаця і маюць частку супольных праектаў і агульную пляцоўку для камунікацыі.
- Аналіз недаступных платформаў і дакументаў. Рэгулярная праблема – праекты рэформаў недаступныя для шырокай грамадскасці. Часта атрымліваецца, што дэ-юрэ праект распрацаваны, аднак дэ-факта яго немагчыма прачытаць. Напрыклад, не адкрываецца вэб-старонка IDSM. На старонцы Офіса па адукацыі некаторыя дакументы толькі анансуюцца, але шырокая аўдыторыя не мае да іх доступу. У такім выпадку недаступныя дакументы траплялі ў агляд паводле магчымасці, у тым ліку тэксты, што былі даступныя «на запыт».

## § 1. Праекты рэформаў Офіса па адукацыі для новай Беларусі

Асноўныя ідэі былі прадстаўлены ў 2021 г. на старонцы з праектамі рэформаў. Частка з іх падрыхтавана ў рамках праграмы «Беларуская адукацыя на шляху перамен», распрацаванай супольна з кансорцыумам «ЕўраБеларусь».

**Непасрэдна для адукацыі вылучаюцца чатыры дакументы:**

- «Дэбюракратызацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь» [5];
- «Дэідэалагізацыя адукацыі Рэспублікі Беларусь: калі і як гэта магчыма» [6];
- «Выбарнасць рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі. Палажэнні аб Савеце і выбарах» [7];
- «Аналіз стану Балонскага працэсу ў Беларусі» [8].

Першыя два дакументы прапануюць глыбінныя змены на ўзроўні ўсёй адукацыйнай сістэмы (напрыклад, змяншэнне ролі міністэрстваў і ўладнай вертыкалі, наданне большых правоў адукацыйным установам, спрашчэнне нарматыўнай базы і інш.). У абодвух дакументах закладзена ідэя суцэльнай глыбіннай трансфармацыі сістэмы адукацыі, што робіць іх несумяшчальнымі з цяперашняй афіцыйнай дзяржаўнай палітыкай. Абодва дакументы можна ацаніць як рамачныя: яны закладаюць патрабаванні да працэсаў трансфармацыі, скасавання негатыўных практык (бюракратызацыі, ідэалагізацыі), аднак не бяруць на сябе місію фарміравання суцэльнага праекта рэформаў.

Два другія дакументы прысвечаны праблемам вышэйшай адукацыі. Мэта палажэння пра выбарнасць рэктараў – сфарміраваць нарматыўную базу на час трансфармацыі сістэмы, каб асобная праблема (адсутнасць аўтаноміі ВНУ пры выбары кіраўніцтва) магла быць вырашана яшчэ да пачатку правядзення рэформаў. Другі з апісаных дакументаў можна лічыць хутчэй аналітычным, аднак у ім закладзена ідэя, што зварот да Балонскай сістэмы мае прыярытэт для развіцця вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Такім чынам, гэтыя дакументы, хаця і даволі вузкія, фактычна закладаюць змену асноўных актараў у дзяржаўнай палітыцы.

## § 2. Прапановы праграмы «Беларуская адукацыя на шляху перамен»

Прапановы праграмы «Беларуская адукацыя на шляху перамен» прадстаўлены часткова на сайце Офіса па адукацыі, часткова як закрытыя аналітычныя дакументы і публічныя дыскусіі.

Прапановы рэформаў гэтай праграмы можна ўмоўна падзяліць на два кірункі: «шырокія» і «вузкія».

**У якасці «шырокага» праекта можна вылучыць:**

- дарожную карту падрыхтоўкі да рэформаў [9],
- праект падрыхтоўкі рэформаў [10].

Асноўная пазіцыя ўдзельнікаў каманды палягае на тым, што для правядзення рэформаў неабходная публічная дыскусія і прысутнасць розных стэйкхолдараў у дыялогу для пабудовы збалансаванай сістэмы. Пры гэтым асноўны кірунак праектаў – апісаць працэсы пераходу ўлады і дзеянні на розных перспектывах (кароткай і далейшай). Папярэдне праводзіўся аналіз стэйкхолдараў і бачанне праблем з боку розных актараў у школьнай адукацыі.

Да «шырокіх» можна аднесці таксама дакумент «Рэформа кіравання адукацыяй» [11] (даследчы праект, праведзены паводле метаду DELFI, калі фіксавалася пазіцыя экспертнай супольнасці наконт прынцыпаў кіравання адукацыяй, дзейных асоб і задач). Была сфарміравана абагульненая рамачная пазіцыя. У якасці кансэнсуснай можна вызначыць скіраванасць на дэцэнтралізаванасць адукацыйнай сістэмы і развіццё грамадскага фокуса кіравання. Як і папярэднія дакументы, гэтая праграма арыентавана на глыбінную трансфармацыю цяперашняй сістэмы і прыцягненне розных актараў да яе фарміравання. Як і ў праектах Офіса па адукацыі, ёсць падзел перыядаў рэфармацыі: хуткія змены і паступовая выпрацоўка грунтоўнага бачання з прыцягненнем розных стэйкхолдараў.

**Акрамя шырокіх праектаў, праграма прапануе рамачныя дакументы для пэўных кірункаў:**

- «Лічбавая кампетэнтнасць у новай Беларусі» [12] (дакумент спасылаецца на праекты ЮНЕСКА, АЭСР, DigCompOrg і на іх падставе прапаноўвае бачанне працэсу лічбавай

трансфармацыі беларускай адукацыі на ўсіх узроўнях).

- «Адукацыйныя ініцыятывы Беларусі: карта ўзаемадзеянняў» [13] (даследчы праект, які аналізуе стан сектара недзяржаўных адукацыйных ініцыятыў. Не змяшчае спецыфічных праектаў рэформаў, аднак скіраваны на развіццё грамадзянскага сектара).
- «Параўнальны агляд адукацыйных палітык у краінах Еўропы» [14] (аналізуюцца рэформы ў Венгрыі, Літве, Славакіі, прапаноўваюцца прыярытэтныя кірункі трансфармацый: паляпшэнне якасці падрыхтоўкі настаўнікаў, якасці кіравання школамі, змены ў сістэмах ацэнкі і фінансавання).
- «Стварэнне інклюзіўнага адукацыйнага асяроддзя ў школах Беларусі: арыенціры» [15] (прапаноўваецца Канцэпцыя развіцця інклюзіўнай адукацыі, якая сумяшчае беларускі досвед і канцэпцыі Сусветнага банка і ЮНЕСКА).
- «Распрацоўка стратэгіі навучання на працягу ўсяго жыцця: check list» [16] (прапаноўваецца агульная рамка палітыкі навучання на працягу ўсяго жыцця і ключавыя кірункі гэтай палітыкі).

З аднаго боку, пералічаныя дакументы закранаюць асобныя, адносна вузкія сферы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі. З іншага, кожны з азначаных дакументаў закладае больш шырокае бачанне адукацыйнай сістэмы як інтэграванай у глабальны кантэкст, скіраванай на дабрабыт асобы пры змяншэнні дыктату сістэмы.

Зместава частка кірункаў праграмы «Беларуская адукацыя на шляху перамен» і цяперашняй дзяржаўнай палітыкі перасякаюцца. Напрыклад, у афіцыйным парадку таксама разглядаюцца лічбавыя кампетэнцыі, інклюзія, паслядыпломнае навучанне. Прынцыпова адрозніваецца падыход да рэалізацыі палітык: неафіцыйныя дакументы скіраваны на інтэграцыю ў сусветны ці агульнаеўрапейскі кантэкст і на павышэнне аўтаноміі актараў, дзяржаўная палітыка імкнецца да ізаляцыі і цэнтралізацыі пры рэалізацыі адных і тых жа кірункаў рэфармавання.

Пазіцыю праграмы «Беларуская адукацыя на шляху перамен» можна апісаць як поўную перабудову адукацыйнай сістэмы (а не як змену асобных працэсаў) на тых падставах, якія будуць вызначаны ў працэсе грамадскага дыялогу. Пры гэтым рамачныя дакументы арыентуюцца на міжнародныя дакументы (ЮНЕСКА, Балонская сістэма, АЭСР), што імпліцытна закладае еўрапейскую рамку і больш ліберальны, у параўнанні з цяперашняй палітыкай, падыход. Пры гэтым у праекта «Беларуская адукацыя на шляху перамен» ёсць асобны кірунак дзейнасці (напрыклад, відэадыскусія на YouTube), дзе больш дакладна абмяркоўваюцца магчымыя сцэнарыі і змены (напрыклад, у забеспячэнні роўнасці).

# § 3. Праекты рэформаў IDSM / «Новай Беларусі»

**Аналітыка і прапановы рэформаў IDSM прадстаўлены ў наступных дакументах:**

- «Сістэма вышэйшай адукацыі Беларусі: стан, праблемы і кірункі рэфармавання» (2021) [17];
- «Прававыя магчымасці і практычная рэалізацыя студэнцкага прадстаўніцтва і самакіравання ў РБ, Украіне, Расіі і Германіі» (2021) [18];
- «Рэфармаванне сістэмы адукацыі Беларусі ў кірунку пашырэння інстытуцыйнай аўтаноміі і развіцця самакіравання адукацыйных установаў» (2022) [19].

На сайце «Новай Беларусі» [20] прадстаўлены асноўныя ідэі з азначаных дакументаў. Праекты рэформаў апісаны на двух узроўнях: па-першае, дарожная карта рэформаў, якая апісвае агульныя кірункі дзеянняў. Па-другое, аналіз праблем і прапановы для ўсіх ступеняў адукацыі (ад дашкольнай да паслядыпломнай адукацыі).

У адрозненне ад праектаў Офіса па адукацыі і праграмы «Беларуская адукацыя на шляху перамен», гэты праект рэформаў не апісвае працэсу змены ўлады, аднак прапаноўвае дакладнае бачанне трансфармацыі адукацыйнай сістэмы. У аснове бачання ляжыць ліберальная мадэль пабудовы адукацыйнай сістэмы з высокім узроўнем аўтаноміі і самакіравання, дэбюракратызацыяй, грамадзянскім кантролем, канкурэнтнай сістэмай заахвочвання, збліжэння адукацыі і рынку.

Як і ў папярэдніх кейсах, прапанаваныя трансфармацыі глыбінна адрозніваюцца ад цяперашняй дзяржаўнай палітыкі, патрабуюць значных змен ва ўсёй сістэме кіравання. Адначасова прадугледжваецца магчымасць пераемнасці: аўтары прапануюць папраўкі для новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі.

## § 4. Праекты рэформаў «За Беларусь»

Праект рэформаў у адукацыі быў прадстаўлены партыяй «Грамада» [21], аднак, паводле апісання, прадстаўляе кансалідаваную пазіцыю некалькіх партый. Праект размешчаны на старонцы «Рэанімацыйны пакет рэформаў для Беларусі», на якой ёсць магчымасць яго каментаваць, аднак рэальных водгукаў няма. Паводле формы гэты праект падобны да папярэдняга, калі прапаноўваецца канкрэтнае бачанне развіцця адукацыйнай сістэмы. У яго аснове ляжыць хутчэй не перабудова ўсёй адукацыйнай сістэмы, а пэўныя змены ў Кодэксе аб адукацыі і ў мадэлях кіравання адукацыяй на розных узроўнях.

Адзін з ключавых і першых пунктаў праграмы – нацыянальны аспект навучання, замацаванне беларускай мовы як асноўнай для навучання. Важная роля адводзіцца сацыяльнай абароне з боку дзяржавы і гарантаванню бясплатнай адукацыі. Атэстацыя ўстаноў адукацыі і асобных настаўнікаў ці выкладчыкаў застаюцца замацаванымі за дзяржавай, аднак адначасова праект прызнае ролю прыватных устаноў адукацыі. Паводле закладзеных у гэтым праекце рэформаў прынцыпаў яго можна аднесці хутчэй да сацыял-дэмакратычнага крыла.

## § 5. Прапановы Банка ідэй

На гэтай пляцоўцы прапануюцца ідэі і праекты ад асобных экспертаў, таму часцей за ўсё яны не ахопліваюць трансфармацыі ўсёй адукацыйнай сістэмы, а скіраваны на канкрэтныя кірункі. На старонцы прадстаўлены дзве прапановы:

«Двухмоўнае аднамоўе. Моўная палітыка ў Беларусі: стан, тэндэнцыі і перспектывы» (2022) [22];

«Пра што гаворыць PISA? Рэкамендацыі для сістэмы адукацыі Беларусі» (2023) [23].

Гэтыя прапановы не адносяцца да сістэмных і хутчэй азначаюць кірункі праблем і рашэнняў, ствараюць падставу для дыялогу. Аднак фактычна колькасць незалежных прапаноў для рэфармавання сістэмы адукацыі нязначная, дыялогу на пляцоўцы няма.

## § 6. Грамадскі балонскі камітэт

Арганізацыя займаецца даследаваннямі і аналізам вышэйшай адукацыі, публікуе ацэнку стану рэалізацыі прынцыпаў Балонскай сістэмы. У гэтым сэнсе прапановы рэформаў ініцыятывы закранаюць толькі вышэйшую адукацыю і скіраваны на рэалізацыю канкрэтнай дарожнай карты рэформаў, якая ўжо распрацавана ў межах Балонскай сістэмы. Пры гэтым ініцыятыва менш закранае пытанні агульнага кіравання сістэмай адукацыі, хутчэй яна канцэнтруецца на асобных аспектах, напрыклад, на лібералізацыі і зніжэнні ролі дзяржавы.

## § 7. Абагульненне праектных прапаноў

Прапановы рэформаў недзяржаўных актараў не з’яўляюцца адзінымі, універсальнымі, якія б прадстаўлялі кансалідаваную пазіцыю. У іх ёсць разыходжанні не толькі ў змесце, але і ў парадыгме падыходаў да працэсу рэфармавання. Можна вылучыць два падыходы да стварэння праектаў рэформаў:

- Скіраваныя на поўную перабудову адукацыйнай сістэмы (Офіс па адукацыі, «Беларуская адукацыя на шляху перамен», IDSM, «Новая Беларусь»). Такія праекты грунтуюцца на тым, што сістэма адукацыі патрабуе радыкальных змен. Пры гэтым для праектавання варта выбудаваць працэс дыялогу розных зацікаўленых груп. Праектныя групы канцэнтруюцца не столькі на выбудоўванні дакладнага бачання рэформаў тут і цяпер, колькі на працэсе падрыхтоўкі рэформаў. Аксіяматычнымі можна лічыць толькі дэідэалагізацыю і дэбюракратызацыю, хуткія крокі ў наданні большай аўтаноміі ВНУ праз выбарнасць рэктараў. Хаця імпліцытна гэтыя ж праектныя групы закладаюць прынцыпы інтэграцыі ў міжнародную прастору праз рамачныя дакументы (інклюзія, навучанне на працягу жыцця, лічбавая

трансфармацыя, рэформа кіравання адукацыяй і інш.). Перавага такога падыходу ў тым, што ён улічвае неабходнасць дэмакратычнага дыялогу пры правядзенні рэформаў. Аднак падыход не дае канкрэтнага бачання для шырокай аўдыторыі, бо яно пасля мусіць быць выпрацавана супольна.

- Скіраваныя на асобныя змены ў сістэме («За Беларусь», ГБК, Банк ідэй). У гэтым выпадку праектныя каманды і эксперты працуюць часцей з дзяржаўным Кодэксам аб адукацыі і з наяўнай мадэллю кіравання адукацыяй, прапаноўваючы канкрэтныя спецыяльныя змены. Частка з іх значна адрозніваецца ад дзяржаўнага курсу (напрыклад, моўная палітыка, палітыка ў кірунку прыватнай адукацыі) і патрабуе значнай перабудовы адукацыйнай сістэмы. Аднак канцэптуальна гаворка ідзе пра змену пэўных кірункаў развіцця, а не пра радыкальную перабудову ўсёй сістэмы.

**У якасці праблемных зонаў у альтэрнатыўных праектах рэформаў можна вылучыць наступныя:**

*Неафіцыйныя дакументы часта не бачныя для шырокага кола грамадства*. Гэта можна патлумачыць цяжкасцямі абмену інфармацыяй паміж праектнымі камандамі і грамадскасцю, рызыкай рэпрэсій пры ўдзеле ў рэфармаванні, раскіданасцю праектных камандаў па розных краінах. Аднак можна канстатаваць і праблемы пабудовы дыялогу за межамі экспертнага кола. Часта публічная дзейнасць ініцыятывы спыняецца, калі завяршаецца дзейнасць у межах праекта. Некаторыя сайты робяцца недаступнымі, некаторых праекты не маюць сайтаў, акрамя старонак у сацыяльных сетках. З аднаго боку, гэта можа быць звязана з блакаваннем даменаў і сервераў. З іншага, з даволі абыякавым стаўленнем ініцыятыў да знешняй камунікацыі.

*Адсутнасць дыялогу*. Хаця тэхнічна ёсць механізмы абмеркавання праектаў рэформаў, грамадская дыскусія выглядае замарожанай. На сайтах грамадзянскіх пляцовак няма каментарыяў пад рэформамі, прапануецца звычайна толькі адзін варыянт рэформаў без зваротнай сувязі. Публічныя дыскусіі магчымыя толькі за межамі Беларусі.

*Неразвітасць палітычнага поля*. Калі ўлічваць не працэсавыя, а зместавыя прапановы, можна казаць, што ў публічным полі прадстаўлены толькі дзве сістэмна апісаныя праграмы рэформаў. Адна з іх больш схіляецца да правага ліберальнага кірунку, другую можна ахарактарызаваць хутчэй як левацэнтрысцкую. Аднак роля, якую ў развітых дэмакратыях выконваюць партыі ў тлумачэнні і адвакацыі сваіх прапаноў, застаецца не задзейнічанай. Гэта прыводзіць да таго, што няма значнага выбару праектных прапаноў і ўключанасці розных зацікаўленых груп у дыскусію.

## 3. Суаднясенне дзяржаўных і недзяржаўных праектаў рэформаў

Калі да 2020 г. не было значных праграм рэформаў, якія б атрымалі падтрымку экспертнай супольнасці і былі скіраваны на грунтоўную трансфармацыю ўсёй адукацыйнай сістэмы, то пасля 2021 г. такія прапановы сталі магчымымі. За апошнія тры гады назіраецца трэнд усё большага разыходжання дзяржаўных і неафіцыйных праграм рэформаў. Хаця ёсць частка рамачных праектных прапаноў (напрыклад, дакументы на тэму інклюзіі, дыгіталізацыі, навучання на працягу жыцця), якія тэматычна перасякаюцца з дзяржаўнымі дакументамі, істотна адрозніваюцца падыходы да іх асэнсавання і мадэляў рэалізацыі. Аднак асноўны трэнд у тым, што дзяржава імкнецца да ўсё большай замкнёнасці і ідэалагізацыі адукацыі, а ў праграмах незалежных актараў дэідэалагізацыя, дэбюракратызацыя выступаюць першаснымі пунктамі. Неафіцыйныя праектныя прапановы ставяць пытанне беларускай мовы ў адукацыі (пры розных сцэнарыях ад розных актараў: ад абавязковага ўкаранення – да сістэмы мяккіх стымулаў), прапануюць развіццё прыватнага сектара адукацыі на ўзроўні сярэдняй школы.

У прадстаўленых тэкстах прысутнічае кансэнсус неафіцыйных актараў у пытанні набліжэння беларускай вышэйшай адукацыі да прынцыпаў Балонскай сістэмы, што цалкам супярэчыць дзяржаўнай палітыцы. Такім чынам, трэнд разыходжання дзяржаўнай палітыкі і неафіцыйнага дыскурсу ўзмацняецца.

[1] Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Пункт доступу: https://edu-office.org/ru/reforms/документы-и-материалы-2021-года/.

[2] Банк ідэй. Пункт доступу: https://www.ideasbank.vision/be/projects.

[3] «Новая Беларусь». Пункт доступу: https://newbel.info.

[4] Рэанімацыйны пакет рэформаў для Беларусі. Пункт доступу: http://zabelarus.com/2023/02/11/рэформа-сістэмы-адукацыі/.

[5] Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Дэбюракратызацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/debureaucratization.

[6] Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Дэідэалагізацыя адукацыі Рэспублікі Беларусь: калі і як гэта магчыма (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/deideologization.

[7] Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Выбарнасць рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі. Палажэнні аб Савеце і выбарах. Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/council.

[8] Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Аналіз стану Балонскага працэсу ў Беларусі (2021). Пункт доступу: https://reform.edu-office.org/bologna.

[9] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Дарожная карта па падрыхтоўцы да рэформы адукацыі (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/roadmap.

[10] Атрыманы на запыт.

[11] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Рэформа кіравання адукацыяй (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/reform.

[12] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Лічбавая кампетэнтнасць у новай Беларусі (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/digital.

[13] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Адукацыйныя ініцыятывы Беларусі: карта ўзаемадзеянняў (2021). Пункт доступу: https://edu-reform.eu/map.

[14] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Параўнальны агляд адукацыйных палітык у краінах Еўропы (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/comparison.

[15] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Стварэнне інклюзіўнага адукацыйнага асяроддзя ў школах Беларусі: арыенціры (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/inclusion.

[16] «Беларуская адукацыя на шляху перамен». Распрацоўка стратэгіі навучання на працягу ўсяго жыцця: check list (2021). Пункт доступу: http://reform.edu-office.org/lifelong.

[17] Атрыманы на запыт.

[18] Атрыманы на запыт.

[19] Атрыманы на запыт.

[20] «Новая Беларусь». Рэформа сістэмы адукацыі. Пункт доступу: https://newbel.info/2021/07/08/educational-reform/.

[21] Рэанімацыйны пакет рэформаў для Беларусі. Рэформа сістэмы адукацыі (2021).
Пункт доступу:http://zabelarus.com/2023/02/11/рэформа-сістэмы-адукацыі/.

[22] Двухмоўнае аднамоўе. Моўная палітыка ў Беларусі: стан, тэндэнцыі і перспектывы. Пункт доступу: https://www.ideasbank.vision/ru/projects/12.

[23] О чём говорит PISA? Рекомендации для системы образования Беларуси. Пункт доступу: https://www.ideasbank.vision/ru/projects/24.



# Частка V

## Аналіз нефармальных (альтэрнатыўных) адукацыйных арганізацый і ініцыятыў, якія з’явіліся з 2020 г. у краіне і за яе межамі

Мэта гэтага даследавання – вызначыць, якія мэты з’яўляюцца першаснымі для прадстаўнікоў адукацыйных ініцыятыў і ці гатовыя яны ўключацца ў прадстаўніцтва гэтых мэтаў як палітычныя суб’екты.

У рамках даследавання было праведзена 10 паўструктураваных інтэрв’ю з прадстаўнікамі адукацыйных ініцыятыў. Ініцыятывы абіраліся з пазіцыі прадстаўленасці розных тыпаў арганізацый: беларуская школа ў замежжы; асветніцкія праекты; адукацыйны цэнтр для дзяцей з дыяспары; ініцыятывы падтрымкі тых, хто працаваў ці працуе ў адукацыі і навуцы; грамадзянскія актывісцкія праекты з адукацыйным кірункам; адукацыйнае медыя. Ініцыятывы дзеля бяспекі не называюцца, таксама ў тэксце адсутнічаюць ускосныя звесткі, праз якія можна было б іх вылічыць.

**Інтэрв’ю было падзелена на тры блокі:**

**Мэты, прынцыпы і бачанне.** Мэта блока – адказаць на пытанне, ці ёсць у прадстаўнікоў ініцыятыў стратэгічнае бачанне прынцыпаў і будучыні беларускай адукацыі.

**Стаўленне да рэформаў.** Мэта блока – замераць узровень ведаў і ўдзелу ў падрыхтоўцы рэформаў у сістэме адукацыі, а таксама вызначыць прынцыповае стаўленне да рэформаў.

**Палітычная пазіцыя.** Мэта блока – вызначыць сістэму палітычных прынцыпаў, у якіх сябе асэнсоўваюць лідары/прадстаўнікі беларускіх ініцыятыў, а таксама высветліць гатоўнасць уключацца ў палітычнае прадстаўніцтва гэтых мэтаў і прынцыпаў.

# Блок 1. Мэты і бачанне

## 1.1. Мэты дзейнасці: цяпер і ў перспектыве

Мэтай наступнага пытання было вызначыць, канцэнтруюцца ініцыятывы выключна на рэалізацыі праграмных, першапачатковых мэтаў – або мяркуюць у будучыні фарміраваць шырэйшае бачанне беларускай адукацыі.

Большасць ініцыятыў не мелі ўнутры арганізаванага абмеркавання агульнага вобраза будучыні беларускай адукацыі. Тым не менш, назіраюцца некалькі тэндэнцый:

- частка арганізацый закранала гэтую тэму ў нефармальнай камунікацыі і супрацоўніцтве;
- хаця ініцыятывы не арыентаваны на пабудову разгорнутага бачання, прадстаўнікі свядома вызначаюць прынцыпы, на базе якіх мусіць будавацца адукацыя ці кірунак іх дзейнасці (для часткі арганізацый гэта замацавана ў афіцыйных дакументах, напрыклад, на сайце ці ў статутных дакументах).

Абагульненае апісанне ўмоўна тыповай ініцыятывы: у арганізацыі няма разгорнутага вобраза будучыні адукацыі, але ёсць набор мэтаў і прынцыпаў, наконт якога ёсць супольная згода. Адбываюцца перыядычныя размовы пра тое, як мусяць выглядаць асобныя сферы функцыянавання адукацыі (асабліва тыя, на якія скіравана экспертыза ініцыятывы).

## Блок 2. Стаўленне да праектаў рэформаў

Прадстаўнікі ініцыятыў маюць розны ўзровень дасведчанасці ў праектах рэформаў беларускай адукацыі ў будучыні.

Рэспандэнты ведаюць, што нешта пра рэформы абмяркоўваецца ў дыяспарах, але не вельмі дакладна. Адна рэспандэнтка адзначыла, што ведае толькі афіцыйныя дзяржаўныя дакументы пра школьныя рэформы і ставіцца да іх негатыўна.

Часцей за ўсё аўтарамі праектаў рэформаў называецца Офіс Святланы Ціханоўскай (хаця фактычна праекты прадстаўлены на сайце Офіса па адукацыі для новай Беларусі) ці Каардынацыйная рада (хаця ад яе імя не было ніводнага праекта рэформаў). Аўтары праектаў рэформаў часцей не вядомыя рэспандэнтам. Часцей за ўсё рэспандэнты ведаюць толькі пра існаванне гэтых рэформаў (у прыватнасці – дарожнай карты), але не маюць сфарміраванай пазіцыі наконт іх зместу.

Адзін рэспандэнт адзначыў, што яго ініцыятыва ўдзельнічала ў распрацоўцы дарожнай карты на этапе кансультавання (відаць, мелася на ўвазе «закрытая» дарожная карта рэформаў, якая прэзентавалася для ЕС і не публікавалася адкрыта).

Ён адзначыў важную ролю карты для супрацоўніцтва з Еўрасаюзам і для пабудовы больш інклюзіўнай праграмы падтрымкі адукацыі Беларусі.

Прадстаўнік іншай ініцыятывы выказаў рэзкае негатыўнае стаўленне да праграмы рэформаў Офіса Святланы Ціханоўскай. Можна выказаць гіпотэзу, што негатыўнае стаўленне да арганізацыі можа пераносіцца на праекты рэформаў. Асноўная прэтэнзія заключалася ў занадта высокай канцэнтрацыі на праектах для «заўтра», якое пакуль не вядомае, замест вырашэння больш актуальных праблем «цяпер».

Ніхто не адзначыў іншых праектных прапаноў рэформаў, якія публікаваліся б іншымі актарамі, акрамя як Офісам Святланы Ціханоўскай, Каардынацыйнай радай і афіліяванымі ініцыятывамі.

## 2.2. Удзел у абмеркаванні рэформаў

Сярод прычын, чаму ініцыятывы не ўдзельнічаюць у стварэнні рэформаў, адзначаліся наступныя:

- не хочуць быць афіліяванымі з палітычнымі сіламі дзеля бяспекі аўдыторыі ў Беларусі;
- не бачаць сэнсу планаваць на перспектыву ў сітуацыі з высокай доляй няпэўнасці, канцэнтруюцца на актуальных праблемах;
- не адчуваюць, што да іх думак гатовыя прыслухоўвацца;
- ізаляванасць, «недаступнасць» тых, хто распрацоўвае рэформы;
- не бачаць сябе экспертамі ў палітычных пытаннях.

Пры адказе на пытанне пра тое, якія маглі б быць умовы ўдзелу ў абмеркаванні рэформаў, у ініцыятыў было кансэнсуснае стаўленне, што важныя роўнасць, наяўнасць пляцоўкі, давер і гатоўнасць пытаць пра думку ўдзельнікаў «не для птушачкі».

Частка ініцыятыў пазначала, што мае абмежаваныя веды ў працэсе выпрацоўкі рэформаў, пры гэтым ёсць экспертыза ў пэўнай сферы, магчымасць арганізаваць зваротную сувязь з мэтавай аўдыторыяй непасрэдна ў Беларусі.

З адказам на пытанне, як мусіць выпрацоўвацца бачанне беларускай адукацыі, існуе кансэнсус, што гэта мусіць быць інклюзіўны працэс з прадстаўленасцю розных груп. Аднак ёсць розныя ўяўленні, што гэта можа значыць на практыцы:

- нехта бачыць гэты працэс магчымым толькі ў выпадку, калі сфарміруюцца палітычныя сілы непасрэдна ў Беларусі;
- нехта ўскладае гэтую функцыю на Каардынацыйную раду;
- нехта вылучае шырэйшыя групы актараў: настаўнікі, бацькі, вучні;
- часам рэспандэнты называюць рухавікамі арыентаваных на пратэсты беларусаў у краіне і дыяспары.

Аднак амаль усе ўдзельнікі адзначаюць важнасць гарызантальнасці, уліку розных думак, некаланіяльнасці ў выпрацоўцы рашэнняў.

## 2.3. Мэты і прынцыпы для беларускай адукацыі

Рэспандэнтам задаваўся шэраг пытанняў, як мусяць выпрацоўвацца мэты і прынцыпы беларускай адукацыі і якія з іх яны назвалі б ад сваёй ініцыятывы.

Можна адзначыць высокі ўзровень кансэнсусу. Найбольш часта называліся:

- свабода, магчымасць выбару;
- беларускасць (важнасць распаўсюду беларускай мовы ў адукацыі адзначалі таксама і рускамоўныя рэспандэнты);
- адкрытасць і інтэграванасць у глабальную адукацыю;
- арыентацыя на чалавека (халістычны падыход);
- дэмакратычнасць, развіццё грамадзянскасці;
- дабрабыт, павага.

Таксама высокі ўзровень аднадумства быў і адносна пытання, як мусіць змяніцца падыход да кіравання ў беларускай адукацыі. У шырокім сэнсе самыя частыя адказы былі пра дэцэнтралізацыю, дэбюракратызацыю і дэідэалагізацыю адукацыі. Пры гэтым прадстаўнікі называлі і больш дробныя змены, напрыклад, скасаванне размеркавання ва ўніверсітэтах, наяўнасць адукацыйнай аналітыкі і даследаванняў у кіраванні, артыкуляванасць мэтаў і прынцыпаў у кіраванні адукацыяй, пошук прафесійных лідараў і іх падрыхтоўка, апісанне адміністрацыйных практык good governance, фарміраванне нагледжанасці патэнцыйных кіраўнікоў у адукацыі.

## Блок 3. Палітычная суб’ектнасць

Удзельнікам задавалася пытанне, ці бачаць яны сябе суб’ектамі адукацыйнай палітыкі цяпер і як можна было б прыцягнуць іх да большага ўдзелу.

Большасць ініцыятыў адзначылі, што цяпер яны хутчэй не праяўляюць сябе палітычна. Аднак намеры і стаўленне рэспандэнтаў былі рознымі:

- частка рэспандэнтаў скіравана на патэнцыйны актыўны ўдзел: пераважна ініцыятывы звязваюць гэта з тым, што першапачаткова ініцыятыва ўзнікала з іншымі мэтамі (больш кан’юнктурнымі), аднак цяпер яна здольная вырашаць шырэйшае кола пытанняў;
- частка рэспандэнтаў скіравана на кансультацыйную ролю і гатовая дзяліцца экспертызай на запыт.

У якасці ўмоваў удзелу называліся фактары, падобныя да тых, што згадваліся пры абмеркаванні рэформаў:

- наяўнасць запрашэння з боку суб’ектаў, якія гэтым займаюцца;
- дэмакратычная, гарызантальная мадэль камунікацыі;
- гатоўнасць пераўтвараць ідэі ў практычныя крокі.

## Такім чынам:

*Абагульнены партрэт беларускай адукацыйнай ініцыятывы (пасля 2020 г.)*: арганізацыя, што ўзнікла як адказ на канкрэтны выклік, запыт мэтавай аўдыторыі. За гэты час большасць ініцыятыў змаглі вызначыць і, часцей за ўсё, асэнсаваць свае асноўныя прынцыпы і мэты дзейнасці, напрацаваць экспертызу ў сваёй галіне. Ініцыятывы дзейнічаюць лакальна ў сваім кірунку працы і пакуль што мала ўдзельнічаюць у супольных актыўнасцях для выпрацоўкі бачання беларускай адукацыі.

Звычайна прадстаўнікі ініцыятыў маюць вельмі павярхоўныя ўяўленні пра змест праектных рэформаў і іх аўтараў. Гатовыя прымаць удзел у супольнай працы дзеля вызначэння мэтаў і прынцыпаў адукацыі ў Беларусі, бачаць у гэтым сэнс, аднак гатовыя гэта рабіць толькі на ўмовах роўнай дэмакратычнай камунікацыі са зваротнай сувяззю. Самі пакуль што не гатовыя выступаць ініцыятарамі такога абмеркавання, але гатовыя далучыцца пры адпаведным запрашэнні. Ініцыятарамі працэсу аб’яднання бачаць Офіс Святланы Ціханоўскай і Каардынацыйную раду.



# Частка VI

## Аналіз матэрыялаў публічных мерапрыемстваў (канферэнцыі, дыскусіі, прапановы актывістаў, экспертаў, рэфарматараў і іншых актараў адукацыі), прысвечаных рэформам сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь

У гэтым матэрыяле пададзены вынікі аналізу мерапрыемстваў (відэаблогі, канферэнцыі, майстэрні, дыскусіі, семінары, вэбінары і інш.), прысвечаных праблемам адукацыі і праведзеных з 2020 г. па ліпень 2023 г., а таксама вынікі параўнальнага аналізу тэматычных лейтматываў, што дамінуюць у гэтых мерапрыемствах, з ключавымі топікамі праграмных дакументаў і праектаў рэформаў (гл. ч. III). На гэтай падставе былі вызначаны пункты перасячэння і разыходжання лейтматываў мерапрыемстваў з ключавымі топікамі праграмных дакументаў і праектаў рэформаў, падрыхтаваных афіцыйнымі полісімейкерамі і незалежнымі экспертамі ў сферы адукацыі Беларусі.

Логіка даследавання вызначалася рашэннем названых вышэй задач. На першым этапе падчас кантэнт-аналізу была праведзена апрацоўка масіву дадзеных (відэа-, аўдыя- і тэкставых матэрыялаў) і складзены лаканічныя рэзюмэ асноўных мерапрыемстваў. Дзякуючы праведзенай працы атрымалася скласці пералік ключавых тэмаў (тэматычных лейтматываў), якія дамінуюць у розных супольнасцях і на розных камунікатыўных пляцоўках. На другім этапе на падставе параўнальнага аналізу былі вызначаны перасячэнні і разыходжанні ключавых лейтматываў разгледжаных мерапрыемстваў з ключавымі топікамі праграмных дакументаў і праектаў рэформаў, падрыхтаваных афіцыйнымі полісімейкерамі і незалежнымі экспертамі ў сферы адукацыі Беларусі і прадстаўленых у ч. III.

## § 1. Ключавыя тэмы (зместавыя лейтматывы) мерапрыемстваў, прысвечаных адукацыі і адукацыйнай палітыцы ў Беларусі і праведзеных з верасня 2020 г. па люты 2022 г.

Паводле зместавых акцэнтаў тэматыка ўсіх мерапрыемстваў можа быць умоўна падзелена на два перыяды: 1) з 2020 г. да пачатку вайны ва Украіне (люты – сакавік 2022 г.); 2) з пачатку вайны ва Украіне па цяперашні час. Умоўнасць гэтага дзялення абумоўлена тым, што частка топікаў першага перыяду застаецца рэлевантнай і для другога, перажываючы пры гэтым пэўную трансфармацыю ў зместавых акцэнтах, інтэнсіўнасці і фармулёўках.

**Ключавыя тэмы мерапрыемстваў з восені 2020 г. па люты 2022 г.:**

За перыяд з 2020 г. па люты 2022 г. было праведзена больш за 20 мерапрыемстваў, прысвечаных адукацыі і адукацыйнай палітыцы ў Беларусі. У гэты перыяд дамінуе ўнутрыбеларускі парадак дня, а агульны кантэкст абмеркавання задаецца грамадскімі пратэстамі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ў Беларусі.

Нягледзячы на пэўнае расчараванне, у цэлым ва ўдзельнікаў дамінуе аптымістычны настрой: канстатуецца абуджэнне грамадзянскай супольнасці і фарміраванне перадумоваў, неабходных для праблематызацыі наяўнай сістэмы адукацыі, а таксама для больш актыўнага ўдзелу грамадзян у адукацыйных ініцыятывах і праектах. У гэты перыяд дамінуюць наступныя тэмы (лейтматывы): *вызначэнне мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі; праблема суадносін адукацыі і палітыкі; суб’екты адукацыйнай палітыкі; крызісная сітуацыя і падрыхтоўка рэформаў (прыярытызацыі праблем і кірункаў рэформаў); праблема суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі РБ і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі); праблема кіравання адукацыяй і інстытуцыйная аўтаномія; акадэмічныя свабоды.* Каратка ахарактарызуем кожную з іх.

## Вызначэнне мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі

Большасць удзельніц і ўдзельнікаў мерапрыемстваў супадаюць у думцы наконт прыярытэтнага (першачарговага) характару вызначэння мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі як неабходнай умовы магчымасці асэнсаванага, эфектыўнага і паспяховага рэфармавання сістэмы адукацыі Беларусі. Пры гэтым ёсць істотныя разыходжанні як у вызначэнні зместу мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі, так і ў спосабах іх фарміравання. Адны мяркуюць, што гэтыя мэты і прынцыпы мусяць мець карэляцыю з палітычнымі інтарэсамі ключавых актараў у адукацыйнай палітыцы. Адпаведна, у рамках такой парадыгмы найперш неабходна дакладна артыкуляваць самі гэтыя палітычныя інтарэсы ключавых актараў і вызначыцца з ідэалогіяй адукацыйнай палітыкі (неаліберальная, левая, кансерватыўная, элітарная, эгалітарысцкая і г. д.). Пры гэтым ва ўсіх ідэалогіях адукацыйных палітык можна вылучыць тры ключавыя інварыянтныя арыенціры: на развіццё рынку працы і прафесійных кампетэнцый, на развіццё салідарнасці і грамадзянскіх кампетэнцый, на развіццё асобы і задавальненне індывідуальных патрэб. Адсюль галоўная задача – знайсці баланс паміж гэтымі трыма вымярэннямі і сістэмамі прынцыпаў у адукацыі Беларусі. Іншыя спікеры настойваюць на вядучай ролі інтэлектуалаў і экспертнай супольнасці, якія мусяць вырашыць усе гэтыя праблемы і прапанаваць грамадству сваё канцэптуальнае бачанне сутнасці (місіі) адукацыі, якая затым можа быць рэтранслявана грамадству і ўзгоднена з полісімейкерамі. Трэція лічаць, што ў вызначэнні мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі трэба арыентавацца на нарматыўныя дакументы, прынятыя міжнароднай адукацыйнай супольнасцю (ЮНЕСКА, ААН, АЭСР і інш.), а галоўная задача заключаецца ў імплементацыі зместавага складніка гэтых мэтаў у сістэму адукацыі Беларусі.

## Праблема суадносін адукацыі і палітыкі

Многія ўдзельнікі мерапрыемстваў маюць згоду ў тым, што дзякуючы палітычнаму крызісу 2020 г. адукацыя, якая раней успрымалася як сістэма, што дзейнічае па-за палітыкай, знайшла сваё выразнае палітычнае вымярэнне. Гэтае вымярэнне дыягнастуецца ўдзельнікамі пераважна негатыўным чынам: напрыклад, школьныя настаўнікі не са сваёй волі былі мабілізаваны ўладай на фальсіфікацыю выбараў, імітацыю падтрымкі і г. д. У той жа час сам факт вымушанай палітычнай уцягнутасці грамадзян дазваляе зрабіць вельмі важны крок у кірунку разумення значна шчыльнейшай узаемасувязі паміж нібыта палітычна нейтральнымі працэсамі адукацыі і рэчаіснасцю адукацыйнай палітыкі. Тым самым робяцца актуальнымі пытанні: актыўнага

удзелу ў адукацыйнай палітыцы «апалітычных» раней стэйкхолдараў (выкладчыкаў, бацькоў, экспертаў, працадаўцаў і інш.); фарміравання іх суб'ектнай пазіцыі ў полі адукацыйнай палітыкі; характару ўзаемадзеяння розных суб'ектаў адукацыйнай палітыкі: (прадстаўнікоў) экспертнай супольнасці, бацькоў, працадаўцаў, чыноўнікаў, палітыкаў); засваення новых практык дэлібератыўнага працэсу, закліканага дапамагчы грамадзянам здабыць сваю суб'ектнасць у полі адукацыйнай палітыкі.

## Суб'екты адукацыйнай палітыкі

Ключавая праблема, на думку экспертаў, заключаецца ў наяўных звычках і інерцыі ранейшых практык, дзе грамадзяне вызначаліся і самавызначаліся як аб'екты адукацыйнай палітыкі. Сіндром «вывучанай бездапаможнасці», які яскрава праявіўся ў сферы адукацыі, робіць вельмі цяжкім фарміраванне суб'ектнасці. На працягу дзесяцігоддзяў рэфарматарская ініцыятыва каралася і прыносіла значна больш выдаткаў самім ініцыятарам, чым набыткаў (карысці) для адукацыі. Прычым гэта тычыцца ініцыятыў як унутры краіны, так і за яе межамі (прыкры досвед шматразовых спробаў рэфармаваць ЕГУ ў Вільні). Многія спікеры і спікеркі адзначаюць, што праблема пагаршаецца дэфіцытам дзеяздольных калектыўных суб'ектаў у сферы адукацыі (прафесійных асацыяцый, прафсаюзаў і інш.). Тым не менш, большасць удзельніц і ўдзельнікаў з аптымізмам глядзяць у будучыню і бачаць магчымасці для вырашэння гэтай праблемы. Пры гэтым думкі наконт шляхоў фарміравання суб'ектнасці падзяліліся. Нехта мяркуе, што ў Беларусі ўжо ёсць экспертныя і прафесійныя педагагічныя супольнасці, якім проста не стае салідарнасці і ўсведамлення сваіх палітычных інтарэсаў. Другія лічаць, што ініцыятыва вывядзення стэйкхолдараў на палітычны ўзровень удзелу мусіць належаць прадстаўнікам экспертнай супольнасці, якія з'яўляюцца «генератарамі ідэй і прамоўтарамі палітычных пазіцый». Трэція лічаць, што без дэлібератыўнага працэсу актывізм экспертаў і чыноўнікаў верне адукацыйную палітыку ў каляіну ранейшай вертыкальнай, аўтарытарнай мадэлі з характэрным для яе абмежаваннем правоў і паўнамоцтваў шараговых стэйкхолдараў.

## Крызісная сітуацыя і падрыхтоўка рэформаў (прыярытызацыі праблем і кірункаў рэформаў)

Большасць удзельніц і ўдзельнікаў мерапрыемстваў сыходзяцца ў думцы адносна прадукцыйнай (пазітыўнай) ролі палітычнага крызісу 2020 г.: ён высветліў для шырокай грамадскасці сістэмныя праблемы адукацыі Беларусі і паставіў на парадак дня неабходнасць правядзення глыбокіх і маштабных (а не касметычных) рэформаў.

Многія ўдзельнікі і ўдзельніцы звяртаюць увагу на неабходнасць высвятлення самога паняцця «рэформа», сэнс якога выпустошаны сістэматычнымі афіцыйнымі імітацыямі рэформаў, што нібыта праводзіліся ўладамі РБ на працягу апошніх трыццаці гадоў. Улічваючы сістэмны характар праблем і маштабнасць рэформаў, існуе неабходнасць вызначыць прыярытэтныя кірункі, да якіх адносяць наступныя: дэідэалагізацыя; дэбюракратызацыя; дэмантаж вертыкальнай, аўтарытарнай мадэлі кіравання і пабудова гарызантальнай, празрыстай мадэлі кіравання з уключаным удзелам і адкрытым доступам усіх стэйкхолдараў (уключэнне грамадскага фокуса кіравання); пашырэнне інстытуцыйнай аўтаноміі; зацвярджэнне акадэмічных свабод.

## Праблема кіравання адукацыяй і інстытуцыйная аўтаномія

Адзін з ключавых кірункаў рэформаў звязаны з радыкальным змяненнем дзейнай у РБ мадэлі кіравання сістэмай адукацыі, якая характарызуецца ўсімі незалежнымі экспертамі як патэрналісцкая, вертыкальная, аўтарытарная і неэфектыўная. Паміж усімі ўдзельнікам ёсць кансэнсуснае разуменне контураў альтэрнатыўнай мадэлі кіравання, якая мусіць мець гарызантальны характар, прадугледжвае моцны «грамадскі фокус кіравання», актыўны ўдзел усіх стэйкхолдараў адукацыі, празрыстасць, справаздачнасць і адказнасць за прыняцце рашэнняў.

Разыходжанні паўстаюць у пытанні шляхоў дасягнення гэтай мэты ці таго, як менавіта можна і трэба пабудаваць альтэрнатыўную мадэль кіравання. Адны настойваюць на адхіленні Міністэрства адукацыі як цэнтральнага органа кіравання, бо, на думку гэтай групы экспертаў, яно манапалізавала ўсе кіраўнічыя функцыі. У гэтай парадыгме ўсе кіраўнічыя функцыі мусяць быць перададзены ўстановам адукацыі, для чаго неабходна забяспечыць ім максімальную ступень інстытуцыйнай аўтаноміі. Іншыя ставяць пад сумнеў эфектыўнасць такога рашэння праз шэраг чыннікаў, сярод якіх варта вылучыць рызыку анархіі ці нават калапсу ў складзеных умовах інстытуцыйных і кіраўніцкіх патэрнаў, а таксама адсутнасць інфраструктуры, якая магла б забяспечыць звычайнае функцыянаванне гарызантальнай мадэлі кіравання (прынамсі, на самым першым этапе). У сувязі з гэтым прапануецца паступовы дэмантаж вертыкальнай мадэлі кіравання з паралельным адбудоўваннем гарызантальнай мадэлі, развіццём працэдур і інстытутаў самакіравання, абуджэннем і заахвочваннем ініцыятывы знізу, стварэннем структур матывацый для выпрацоўкі навыкаў самакіравання, падрыхтоўкай новых кіраўнічых кадраў і г. д. Трэція прапануюць пачынаць пабудову альтэрнатыўнай (гарызантальнай) мадэлі кіравання з запуску дэлібератыўнага працэсу, які мусіць сфарміраваць разуменне ў ключавых стэйкхолдараў, артыкуляваць іх інтарэсы і задзейнічаць

матывацыйныя структуры. З пункту гледжання гэтай групы экспертаў толькі ў выніку шырокага дэліберацыйнага працэсу магчымае стварэнне жыццяздольнай, эфектыўнай і паспяховай гарызантальнай мадэлі кіравання.

## Праблема суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі)

Доўгае існаванне сістэмы адукацыі Беларусі ў інерцыйным рэжыме ізалявала яе ад глабальных (міжнародных) тэндэнцый. Гэты працэс пагоршыўся пасля 2020 г. Таму пераважная большасць удзельніц і ўдзельнікаў мерапрыемстваў маюць згоду наконт неабходнасці значна большай інтэграцыі сістэмы адукацыі Беларусі ў еўрапейскую і міжнародную адукацыйную прастору. Пры гэтым усе ўдзельнікі і ўдзельніцы адзначаюць дэфіцыт у грамадзян РБ і прадстаўнікоў экспертнай супольнасці адэкватнага разумення, засваення і асэнсавання выклікаў, магчымасцяў і тэндэнцый у сучаснай адукацыі. У той жа час многія эксперты адзначаюць, што ў цяперашняй сітуацыі ранейшы фармат удзелу (напрыклад, праз Балонскі працэс) ужо састарэў і не ў поўнай меры адпавядае сучасным выклікам. Акрамя таго, відавочна, што простае запазычанне нейкай «узорнай» мадэлі немагчымае без адаптацыі да наяўных магчымасцяў краіны (кадравых, сацыяльных, палітычных, фінансавых і інш.), што патрабуе выпрацоўкі самастойнага бачання стратэгіі і тактыкі адукацыйнай палітыкі ў будучай дэмакратычнай Беларусі. Такім чынам, галоўная задача – знайсці аптымальны баланс паміж інтэграцыяй у міжнародную адукацыйную прастору, запазычаннем паспяховага замежнага досведу і самавызначэннем у аўтэнтычнай сістэме каардынат краіны.

## Акадэмічныя свабоды

Апошнім у чарзе (але не паводле значнасці) прапануецца шэраг рэформаў у кірунку зацвярджэння і развіцця акадэмічных свабод як неабходнай умовы для стварэння сістэмы адукацыі, заснаванай на прынцыпах адкрытага дэмакратычнага грамадства. У гэтым пытанні існуе абсалютная згода паміж усімі ўдзельнікамі і ўдзельніцамі прааналізаваных мерапрыемстваў, а самі рэформы маюць статут прыярытэтных і першачарговых. У той жа час у гэтым пытанні ёсць пэўныя разыходжанні паводле ступені глыбіні і радыкалізму. Так, некаторыя эксперты лічаць неабходным выключыць выхаваўчую частку з адукацыйнага працэсу (прынамсі, на ўзроўні вышэйшай школы), паколькі ў дзейным заканадаўстве (Кодэкс аб адукацыі) і на практыцы выхаванне трактуецца як дзяржаўнае ідэалагічнае выхаванне або індактрынацыя. Частка экспертаў лічыць неправамерным

выключаць выхаваўчы складнік, але прапануе перафармуляваць яго ў тэрмінах грамадзянскай адукацыі і выхавання грамадзянскіх кампетэнцый дэмакратычнай супольнасці (крытычнае мысленне, салідарнасць і інш.). Адкрытымі застаюцца пытанні акадэмічнай этыкі (этычны кодэкс) і інтэлектуальнай сумленнасці, якія разумеюцца і тлумачацца па-рознаму. Мабыць, усе гэтыя пытанні патрабуюць дадатковага разгляду і абмеркавання з мэтай дасягнення кансэнсусу, прынамсі, на ўзроўні разумення сутнасці ключавых паняццяў, працэдур і інстытутаў.

## § 2. Ключавыя тэмы мерапрыемстваў з сакавіка 2022 г. па ліпень 2023 г.

Пачатак ваеннай агрэсіі РФ ва Украіне ў лютым 2022 г. стаў той шокавай падзеяй, якая прыпыніла актыўнасць экспертаў і ўдзельнікаў мерапрыемстваў адукацыйнай тэматыкі на некалькі месяцаў. Гэта быў час, калі многія эксперты і ўдзельнікі адукацыйнага працэсу спрабавалі знайсці рэлевантны модус настрою думак, які быў бы адэкватны прынцыпова новай сітуацыі ваеннага часу. Фактычна мерапрыемствы адукацыйнай тэматыкі аднавіліся толькі з траўня 2022 г. і ў іх змесце мы бачым істотны зрух у бок новых тэмаў, такіх як: *вайна і адукацыя (зрух дыскурсу ў бок адкрытых пытанняў)*; *ізаляцыя беларускай сістэмы адукацыі ад еўрапейскай прасторы адукацыі і яе асіміляцыя ў адукацыйную прастору РФ*; *сек'юрытызацыя і мілітарызацыя адукацыі*. Прапануем кароткую характарыстыку гэтым тэматычным топікам.

### Вайна і адукацыя (зрух дыскурсу ў бок адкрытых пытанняў)

Сфера адукацыі Беларусі робіцца полем канстыентальнай вайны за светаразуменне і ідэнтычнасць беларусак і беларусаў. Пачаткам вайны ва Украіне і вызначэннем Беларусі міжнароднымі актарамі як краіны-агрэсара задаліся два асноўныя трэнды на знешнепалітычным контуры: поўная ізаляцыя краіны (у тым ліку сферы адукацыі і навукі); абіральная (дыферэнцыраваная) ізаляцыя дзяржаўных адукацыйных інстытутаў і іх афіцыйных прадстаўнікоў пры захаванні супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю і прыватнымі ініцыятывамі ў сферы адукацыі. У сваю чаргу, сітуацыя ўнутры краіны разгортваецца ў кірунку ўзмацнення рэпрэсій, скіраваных на беларускіх грамадзян і прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці.

### Ізаляцыя беларускай сістэмы адукацыі ад еўрапейскай прасторы адукацыі і яе асіміляцыя ў адукацыйнай прасторы РФ

Практычна ўсе незалежныя эксперты, удзельніцы і ўдзельнікі мерапрыемстваў адзначаюць наяўнасць глабальнага знешняга фактару – тэндэнцыі ізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ад адукацыйных прастор развітых краін свету і міжнародных праграм фінансавай падтрымкі.

Эксперты вылучаюць наступныя фактары, вызначальныя для ўнутранага стану сістэмы адукацыі РБ: істотнае скарачэнне фінансавання; заканадаўчае замацаванне і легітымацыя больш радыкальных і жорсткіх формаў дзяржаўнага кантролю дзейнасці адукацыйных устаноў (Кодэкс аб адукацыі 2022); пагаршэнне застарэлых (нявырашаных) сістэмных праблем новымі выклікамі – дэвальвацыя іміджу выкладчыка (пасля масавага ўдзелу ў фальсіфікацыі выбараў 2020 г.); узмацненне жорсткасці кантролю акадэмічнага жыцця і мабілізацыя рэпрэсіўных інстытутаў і механізмаў выяўлення іншадумства, «чысткі шэрагаў» і інш.; індактрынацыя ўсіх удзельнікаў сістэмы адукацыі РБ ідэалагемамі «рускага свету»; вымыванне прафесійных, але не лаяльных кадраў (адпаведна – зніжэнне якасці адукацыі); масавы выхад навучэнцаў з сістэмы адукацыі РБ (яскравы прыклад – недабор 6000 патэнцыйных студэнтаў у ВНУ краіны, у тым ліку больш за 500 – на бюджэтныя месцы); пагроза каланізацыі адукацыйнай прасторы РБ расійскімі чыноўнікамі ад адукацыі і прадстаўнікамі навуковай і акадэмічнай супольнасці РФ; разбурэнне ўнутрыкраінавай інфраструктуры НДА, якая рэпрэзентуе, лабіруе і рэалізуе альтэрнатыўныя афіцыйным (еўрапейскія) адукацыйныя праекты і практыкі; блакаванне (цэнзурай, наглядам і магчымымі санкцыямі, ажно да крымінальных) паўнавартаснай камунікацыі паміж актарамі сферы адукацыі (выкладчыкамі, навучэнцамі, прадстаўнікамі адміністрацыі) унутры краіны і за яе межамі (беларуская дыяспара).

## Сек’юрытызацыя і мілітарызацыя адукацыі

Пераважная большасць экспертаў, удзельнікаў і ўдзельніц адукацыйнага працэсу адзначаюць узмацненне жорсткасці дзяржаўнага кантролю сферы адукацыі і рэпрэсій у дачыненні да супрацоўнікаў адукацыйных устаноў, якія набываюць мэтавы сістэматычны характар і абапіраюцца на новыя інфраструктурныя і кадравыя магчымасці. Менавіта гэтая істотная якасная трансфармацыя ў маштабах, глыбіні і сістэматычнасці кантролю і рэпрэсій маркіруецца экспертамі як сек’юрытызацыя адукацыі.

Мілітарызацыя адукацыі вызначаецца як перавод выхаваўчага складніка адукацыйнага працэсу ў модус агрэсіўнай мілітарысцкай падрыхтоўкі навучэнцаў да канстыентальнай і класічнай канвенцыйнай вайны з ідэалагічным украінскім і заходнееўрапейскім супернікам.

## § 3. Пункты перасячэння і разыходжанні лейтматываў мерапрыемстваў з ключавымі топікамі праграмных дакументаў і праектаў рэформаў

Пераходзячы да наступнай часткі нашага даследавання, неабходна вылучыць некалькі важных момантаў, якія дапамагаюць структураваць звесткі і атрымаць больш яснае і выразнае разуменне вынікаў праведзенага аналізу. Перш за ўсё, варта прыняць да ўвагі, што тэматычныя топікі праектаў і праграм рэформаў, прадстаўленыя ў ч. ІІІ, рэпрэзентуюць два дыскурсы: афіцыйны (у выглядзе міністэрстваў і ведамстваў унутры краіны) і неафіцыйны (у выглядзе незалежных экспертаў і грамадзянскіх актывістаў, якія знаходзяцца пераважна за межамі РБ). Большая частка мерапрыемстваў, прааналізаваных у гэтым матэрыяле, была праведзена прадстаўнікамі незалежнай экспертнай і грамадзянскай супольнасці ў выгнанні. Мерапрыемствы, праведзеныя ўнутры краіны, пераважна немагчыма прааналізаваць, бо няма электронных і тэкставых матэрыялаў мерапрыемстваў (і/або доступу да іх). Такім чынам, у другой частцы даследавання прадстаўлены пункты перасячэння і разыходжанні лейтматываў мерапрыемстваў, праведзеных незалежнымі экспертамі і грамадзянскімі актывістамі ў выгнанні, з 1) ключавымі топікамі афіцыйных праграмных дакументаў і праектаў рэформаў і 2) ключавымі топікамі праграмных дакументаў і праектаў рэформаў незалежных экспертаў у выгнанні.

### Пункты перасячэння і разыходжанні лейтматываў мерапрыемстваў, праведзеных незалежнымі экспертамі і грамадзянскімі актывістамі ў выгнанні, з ключавымі топікамі афіцыйных праграмных дакументаў і праектаў рэформаў

Пераважная большасць праблем і тэматычных топікаў супярэчаць адно аднаму з цалкам зразумелых ідэалагічных і метадалагічных прычын. Так, калі незалежныя эксперты канстатуюць наяўнасць крызісу ў сістэме адукацыі, то ў афіцыйных дакументах мы знаходзім канстатацыі «пэўных недапрацовак і праблем». Эфектыўнасць працы сістэмы адукацыі не ставіцца пад сумнеў ні афіцыйнымі экспертамі, ні тым больш афіцыйнымі полісімейкерамі. У ключавых пытаннях суадносін адукацыі і палітыкі, а таксама самавызначэння новых суб’ектаў адукацыйнай палітыкі і дэмантажу сістэмы кіравання

афіцыйны дыскурс легітымізуе цяперашні status quo з ясным размеркаваннем роляў: паўнавартаснымі суб’ектамі адукацыйнай палітыкі выступаюць афіцыйныя інстытуты (Міністэрства адукацыі, РІВШ і інш.) і іх афіцыйныя прадстаўнікі (міністр адукацыі і намеснік міністра, дырэктар РІВШ, афіцыйныя эксперты і спікеры), тады як усе іншыя «квазісуб’екты» ў найлепшым выпадку дэкларуюцца гэткімі на заканадаўчым узроўні і імітуюцца пры рэалізацыі адукацыйнай палітыкі. Яшчэ больш рэзкім і выразным робіцца несупадзенне дыскурсаў, датычных праблем суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі РБ і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі), акадэмічных свабод, ізаляцыі, сек’ юрытызацыі і мілітарызацыі адукацыі. У той жа час, нягледзячы на істотныя ідэалагічныя адрозненні паміж прадстаўнікамі двух гэтых лагераў, ёсць і пэўныя перасячэнні. Найперш гэта тычыцца вызначэння мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі, якія, прынамсі на дэкларацыйным узроўні, у афіцыйным дыскурсе застаюцца арыентаванымі на агульначалавечыя і/або еўрапейскія прынцыпы, убудоўваюцца ў міжнародны кантэкст тэндэнцый і выклікаў (інавацыйнае развіццё, правы чалавека, прынцыпы грамадства ведаў, канкурэнцыя за рынкі адукацыйных паслуг і працы і інш.). Пры гэтым у афіцыйным дыскурсе дамінуюць два з трох азначаных незалежнымі экспертамі трэндаў:

1) развіцця рынку працы і прафесійных кампетэнцый і 2) развіцця салідарнасці і грамадзянскіх кампетэнцый (якія, праўда, трактуюцца афіцыйным дыскурсам прынцыпова інакш – у дзяржаўна-цэнтраваным і вайскова-патрыятычным рэчышчы). У значна меншай меры (і часцей за ўсё зусім фармальна) згадваецца трэці трэнд – развіцця асобы і задавальнення індывідуальных патрэб. У рамках тэмы «Мэты, прынцыпы і філасофія адукацыі» найбольшая згода паміж афіцыйным дыскурсам і некаторымі прадстаўнікамі незалежнай экспертнай і грамадзянскай супольнасці існуе адносна эгалітарысцкіх прынцыпаў і «прыярытэту масавай, даступнай і справядлівай адукацыі для ўсіх», якія, з нязначнымі разыходжаннямі ў ступені абгрунтаванасці і радыкалізму, супрацьпастаўляюцца элітарным і мерытакратычным прынцыпам, канкурэнтным і рыначным адносінам.

Ёсць таксама пэўныя перасячэнні і ў пытаннях гуманізацыі адукацыі. У прыватнасці, увядзенне паняцця інклюзіі ў новую версію Кодэксу аб адукацыі, права на атрыманне адукацыі падлеткамі, якія знаходзяцца ў месцах зняволення, і іншыя нормы, якія з’явіліся ў афіцыйных нарматыўных дакументах за апошнія тры гады, цалкам могуць інтэрпрэтавацца як «агульныя месцы» абодвух дыскурсаў. Аналагічная сітуацыя з развіццём інстытуцыйнай аўтаноміі: на паверхневым узроўні можна канстатаваць наяўнасць падобных інтэнцый,

фігураванне аналагічных паняццяў і дэкларацыйных заяваў, тады як на глыбейшым канцэптуальным узроўні існуюць істотныя і часам зацятыя супярэчнасці.

**Пункты перасячэння і разыходжанні лейтматываў мерапрыемстваў, праведзеных незалежнымі экспертамі і грамадскімі актывістамі ў выгнанні, з ключавымі топікамі праграмных дакументаў і праектаў рэформаў незалежных экспертаў у выгнанні**

Нягледзячы на тое, што пераважная большасць праблем і тэматычных топікаў трапляюць у катэгорыю перасечаных, толькі нязначная частка лейтматываў мерапрыемстваў знайшла сваё адлюстраванне ў праграмных дакументах і праектах рэформаў незалежных экспертаў у выгнанні. Да такіх, у прыватнасці, адносяцца праекты падрыхтоўкі да рэформаў у сферы адукацыі «Беларуская адукацыя на шляху перамен. Дарожная карта па падрыхтоўцы да рэформы адукацыі» (2021), «Беларуская адукацыя на шляху перамен. Праект падрыхтоўкі рэформаў» (2021), «Беларуская адукацыя на шляху перамен. Распрацоўка стратэгіі навучання на працягу ўсяго жыцця: check list» (2021), «Беларуская адукацыя на шляху перамен. Лічбавая кампетэнтнасць у новай Беларусі» (2021), «Беларуская адукацыя на шляху перамен. Рэформа кіравання адукацыяй» (2021), «Беларуская адукацыя на шляху перамен. Стварэнне інклюзіўнага адукацыйнага асяроддзя ў школах Беларусі: арыенціры» (2021), «Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Дэідэалагізацыя адукацыі Рэспублікі Беларусь: калі і як гэта магчыма» (2021), «Офіс па адукацыі для новай Беларусі. Упраўленне адукацыяй: ад анамальнай бюракратызацыі – да дэцэнтраванай і празрыстай сістэмы» (2021), «Інстытут развіцця і сацыяльнага рынку для Беларусі і Усходняй Еўропы. Прававыя магчымасці і практычная рэалізацыя студэнцкага прадстаўніцтва і самакіравання ў РБ, Украіне, Расіі і Германіі» (2021), «Інстытут развіцця і сацыяльнага рынку для Беларусі і Усходняй Еўропы. Сістэма вышэйшай адукацыі Беларусі: стан, праблемы і кірункі рэфармавання» (2021), «Інстытут развіцця і сацыяльнага рынку для Беларусі і Усходняй Еўропы. Рэфармаванне сістэмы адукацыі Беларусі ў напрамку пашырэння інстытуцыйнай аўтаноміі і развіцця самакіравання адукацыйных устаноў» (2022). Варта таксама адзначыць, што значная частка пералічаных праектаў не змяшчае канкрэтных дыягностык і прапаноў рэформаў, але абмяжоўваецца фіксацыяй агульных кірункаў і таму можа быць кваліфікавана як палітычныя дакументы.

Практычна цалкам не прадстаўлены на праектным узроўні наступныя топікі: *вызначэнне мэтаў, прынцыпаў і філасофіі* (за выключэннем аналітычных дакументаў адносна мэтаў і прынцыпаў ЮНЕСКА і ААН, якія адлюстроўваюць пазіцыю

толькі адной групы незалежных экспертаў); *праблема суадносін адукацыі і палітыкі*; *суб'екты адукацыйнай палітыкі*; *праблема суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі РБ і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі*; *ізаляцыя беларускай сістэмы адукацыі ад еўрапейскай прасторы адукацыі і яе асіміляцыя ў адукацыйную прастору РФ*.



# Высновы

Падзеі 2020 і 2022 гг. значна паўплывалі на дзяржаўныя мадэлі кіравання адукацыяй і дзейнасць недзяржаўных ініцыятыў. Можна адзначыць агульны дзяржаўны трэнд узмацнення кантролю, вертыкалізацыю, мілітарызацыю, сек'юрытызацыю і ізаляцыю беларускай адукацыі. З боку недзяржаўных ініцыятыў назіраецца рост запыту на радыкальную перабудову адукацыйнай сістэмы, пераасэнсаванне яе мэтаў і прынцыпаў. Трэба адзначыць, што гэтыя тэндэнцыі можна лічыць відавочнымі для тых, хто працуе ў адукацыі. У межах гэтага дакумента мы сканцэнтруемся на высновах і назіраннях, якія нам падаюцца менш відавочнымі ў чатырох кірунках:

- дзяржаўныя і недзяржаўныя даследаванні;
- самавызначэнне недзяржаўных адукацыйных ініцыятыў пасля 2020 і 2022 гг.;
- праекты рэформаў;
- зместавае перасячэнне і праблемныя лакуны публічных мерапрыемстваў, даследаванняў і праектаў адукацыйных рэформаў незалежных экспертаў за мяжой Беларусі.

## 1. Дзяржаўныя і недзяржаўныя даследаванні

У фокусе *дзяржаўных* даследаванняў знаходзіцца тэма *якасці адукацыі*. Асноўныя бюджэтныя сродкі выдаткоўваюцца на маніторынгі паспяховасці вучняў і выпускнікоў. Пры гэтым пасля выключэння Беларусі з удзельнікаў PISA заўважны трэнд «імпартазамяшчэння»: афіцыйна было анансавана Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі (якое будуецца паводле метадалогіі PISA, аднак ужо на падставе яе расійскай інтэрпрэтацыі, унутры краіны і без зваротнай сувязі ад міжнародных распрацоўшчыкаў). Таксама праводзяцца рэгулярныя маніторынгі паспяховасці паводле вынікаў ЦТ, але дадзеныя такіх даследаванняў з'яўляюцца закрытымі і не могуць быць выкарыстаны знешнімі актарамі. Хаця ў такіх даследаваннях закладзена лангітудная колькасная метадалогія, часта вынікі непараўнальныя праз розную складанасць заданняў на іспытах. *Недзяржаўныя* даследчыкі з аб'ектыўных прычын не могуць праводзіць даследаванні якасці адукацыі, бо не маюць дазволенага публічнага доступу да вучняў або студэнтаў.

Таму ў фокусе неафіцыйных даследаванняў знаходзяцца хутчэй *якасць кіравання і функцыянавання адукацыі як сістэмы.* Асноўная мэта большасці недзяржаўных даследаванняў – дыягностыка праблем у адукацыі і/ці апісанне магчымых мадэляў іх рашэння. Часцей за ўсё незалежныя даследчыкі абіралі якасную метадалогію (інтэрв'ю ці фокус-групы), аналіз адкрытых дадзеных або кабінетныя даследаванні (напрыклад, аналіз найлепшых практык).

Нягледзячы на значныя цяжкасці і перашкоды, пасля 2020 г. усё ж сфарміраваўся корпус даследаванняў, якія даюць агульнае ўяўленне аб праблемах на розных узроўнях адукацыі (сярэдняя, вышэйшая, прафесіянальна-тэхнічная, дадатковая). Пры гэтым можна адзначыць наступныя праблемы, тоесныя недзяржаўным даследаванням:

- Нябачнасць вынікаў недзяржаўных даследаванняў. Частка даследаванняў не апублікавана ці апублікавана не цалкам, яны даступныя толькі на запыт, хаця іх звесткі ананімізаваны і патэнцыйна маглі б шырока распаўсюджвацца. У гэтым сэнсе можна казаць, што недзяржаўныя даследчыкі паўтараюць дзяржаўны патэрн закрытасці аналітыкі, арыентацыю на вузкае кола «сваіх» экспертаў.
- Практычная адсутнасць сістэмных лангітудных даследаванняў. Пасля прыпынення актыўнай дзейнасці ў Беларусі міжнародных актараў (Сусветнага банка, прыпынення часткі даследаванняў у супрацоўніцтве з ЮНІСЕФ, ЮНЕСКА) не з'явілася актараў, thinktank'аў, якія б займаліся пэўнымі тэмамі ці праблемамі сістэмна. Выключэннем можна лічыць Грамадскі балонскі камітэт, які канцэнтруецца на вышэйшай адукацыі і таксама цяпер прыпыніў сваю актыўную даследчую і грамадскую дзейнасць.

**Зоны росту:**

- Абагульненне і больш шырокі распаўсюд наяўных даследаванняў. Напрыклад, стварэнне каталога адукацыйных даследаванняў паводле кірункаў. Публікацыя ў адзіным месцы тых работ, якія размешчаны на недаступных сайтах. Для часткі даследаванняў магчымая публікацыя сырых (raw) звестак, як гэта прынята ў міжнароднай практыцы.
- Прыцягненне ўвагі да адукацыйных даследаванняў. У Беларусі не наладжаны сувязі паміж публікацыяй даследаванняў і іх распаўсюдам, арганізацыяй абмеркавання вынікаў.

- Падрыхтоўка даследчыкаў у адукацыі. Нягледзячы на цяжкасці збору звестак, яшчэ існуюць магчымасці працягу адукацыйных даследаванняў у Беларусі. Аднак адсутнічае сістэма падрыхтоўкі і фінансавай падтрымкі даследчыкаў.
- Стварэнне адукацыйнага thinktank'а. Праблему даступнасці даследаванняў, іх сістэмнасці, распаўсюду, падрыхтоўкі даследчыкаў мог бы вырашыць аналітычны цэнтр, які б канцэнтраваўся на адукацыйных даследаваннях.

## 2. Самавызначэнне недзяржаўных адукацыйных ініцыятыў пасля 2020 г.

*Абагульнены партрэт беларускай адукацыйнай ініцыятывы (пасля 2020 г.)*: арганізацыя, што ўзнікла як адказ на канкрэтны выклік, запыт мэтавай аўдыторыі. За гэты час многія ініцыятывы змаглі вызначыць і, часцей за ўсё, асэнсаваць свае асноўныя прынцыпы і мэты дзейнасці, напрацаваць экспертызу ў сваёй галіне. Ініцыятывы дзейнічаюць лакальна ў сваім кірунку працы і пакуль што мала ўдзельнічаюць у супольных актыўнасцях для выпрацоўкі бачання беларускай адукацыі. Звычайна прадстаўнікі ініцыятыў маюць вельмі павярхоўныя ўяўленні пра змест праектных рэформаў і іх аўтараў. Гатовыя прымаць удзел у супольнай працы для вызначэння мэтаў і прынцыпаў адукацыі ў Беларусі, бачаць у гэтым сэнс, аднак гатовыя гэта рабіць толькі на ўмовах роўнай дэмакратычнай камунікацыі са зваротнай сувяззю. Самі пакуль што не гатовыя выступаць як ініцыятары такога абмеркавання, але гатовыя далучыцца пры запрашэнні. Ініцыятарамі гэтага працэсу аб'яднання бачаць Офіс Святланы Ціханоўскай і Каардынацыйную раду.

## 3. Праекты рэформаў дзяржаўных і недзяржаўных актараў

Што дзяржаўныя, што недзяржаўныя праекты рэформаў дэкларацыйна заснаваны на прынцыпах гуманізму, роўнасці, рэалізацыі чалавечага патэнцыялу. Аднак на ўзроўні дзяржаўных праектаў рэформаў назіраецца «падвоенасць» праватворчасці і правакарыстання: на ўзроўні праграмных дакументаў (Кодэкс, Канцэпцыя) закладаюцца хутчэй агульначалавечыя дэмакратычныя прынцыпы, аднак на ўзроўні больш прыкладных дакументаў і практык сістэма імкнецца да іерархіі, вертыкалізацыі і мілітарызацыі. У гэтым сэнсе адрозненне недзяржаўных праектаў рэформаў – у тым, што яны імкнуцца захоўваць дэмакратычныя прынцыпы і на ўзроўні агульнага бачання, і на ўзроўні апісання практык рэалізацыі.

Яшчэ адно важнае адрозненне на ўзроўні базавага наратыву ў падрыхтоўцы рэформаў: дзяржаўныя актары сыходзяць з пазіцыі, што «сістэма працуе эфектыўна, патрэбныя касметычныя праўкі». Недзяржаўныя актары сыходзяць з базавай установкі неэфектыўнасці цяперашняй сістэмы і неабходнасці яе грунтоўнай трансфармацыі.

Нягледзячы на значныя разыходжанні, ёсць і значныя кансэнсусныя пазіцыі. І дзяржаўныя, і недзяржаўныя актары супадаюць у скіраванасці:

1. на развіццё рынку працы і прафесійных кампетэнцый;
2. на развіццё салідарнасці і грамадзянскіх кампетэнцый (якія, праўда, трактуюцца афіцыйным дыскурсам прынцыпова інакш – у дзяржаўна-цэнтраваным і вайскова-патрыятычным рэчышчы);
3. на развіццё асобы і задавальненне індывідуальных патрэб (у дзяржаўным дыскурсе гэты трэнд, аднак, застаецца на перыферыі, згадваецца даволі фармальна).

Найбольшая згода паміж афіцыйным дыскурсам і некаторымі прадстаўнікамі незалежнай экспертнай і грамадзянскай супольнасці маецца наконт эгалітарысцкіх прынцыпаў і «прыярытэту масавай, даступнай і справядлівай адукацыі для ўсіх».

Варта адзначыць, што на гэты момант дзяржаўныя праекты рэформаў з'яўляюцца больш комплекснымі, дэталёвымі ў параўнанні з прапановамі недзяржаўных актараў. Неафіцыйныя актары хутчэй апісваюць ці агульную дарожную карту падрыхтоўкі рэформаў, ці шырокія патрабаванні да адукацыйнай сістэмы. Больш дэталёвая распрацоўка пакуль не запатрабавана.

Тры асноўныя праблемныя зоны ў альтэрнатыўных праектах рэформаў – нябачнасць даследаванняў і праектаў для стэйкхолдараў і шырокага кола грамадства (1), адсутнасць дыялогу і абмеркавання са стэйкхолдарамі і з больш шырокім грамадствам (2), неразвітасць палітычнага вымярэння (поля) праграмавання і абмеркавання рэформаў (3) – з'яўляюцца падставай для трох зонаў росту:

1. засяродзіць увагу на знешняй камунікацыі з патэнцыйнымі спажыўцамі даследчых і праектных матэрыялаў;
2. наладзіць каналы зваротнай сувязі са стэйкхолдарамі і прадстаўнікамі шырокага грамадства, наладзіць дыялог паміж усімі зацікаўленымі ўдзельнікамі і ўдзельніцамі адукацыйнага працэсу;
3. звярнуць асобную ўвагу на палітычнае вымярэнне, а таксама на мэты і прынцыпы прапанаваных даследаванняў і рэформаў у галіне адукацыі.

## 4. Зместавае перасячэнне і праблемныя лакуны публічных мерапрыемстваў, даследаванняў і праектаў адукацыйных рэформаў незалежных экспертаў за мяжой Беларусі

За перыяд з 2020 г. па люты 2022 г. было праведзена больш за 20 мерапрыемстваў, прысвечаных адукацыі і адукацыйнай палітыцы ў Беларусі. У гэты перыяд дамінуе ўнутрыбеларускі парадак дня, а агульны кантэкст абмеркавання задаецца грамадскімі пратэстамі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 г. у Беларусі. Нягледзячы на пэўнае расчараванне, у цэлым ва ўдзельнікаў дамінуе аптымістычны настрой: канстатуецца абуджэнне грамадзянскай супольнасці і фарміраванне перадумоваў, неабходных для праблематызацыі дзейнай сістэмы адукацыі, а таксама для больш актыўнага ўдзелу грамадзян у адукацыйных ініцыятывах і праектах. У гэты перыяд дамінуюць наступныя тэмы (лейтматывы): *вызначэнне мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі; праблема суадносін адукацыі і палітыкі; суб'екты адукацыйнай палітыкі; крызісная сітуацыя і падрыхтоўка рэформаў (прыярытызацыі праблем і кірункаў рэформаў); праблема суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі РБ і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі); праблема кіравання адукацыяй і інстытуцыйная аўтаномія; акадэмічныя свабоды.*

Пачатак ваеннай агрэсіі РФ ва Украіне ў лютым 2022 г. зрабіў істотны зрух у бок новых тэмаў, такіх як: *вайна і адукацыя (зрух дыскурсу ў бок адкрытых пытанняў)*; *ізаляцыя беларускай сістэмы адукацыі ад еўрапейскай прасторы адукацыі і яе асіміляцыя ў адукацыйную прастору РФ*; *сек'юрытызацыя і мілітарызацыя адукацыі*.

На падставе аналізу пунктаў перасячэння і разыходжання лейтматываў мерапрыемстваў, праведзеных незалежнымі экспертамі і грамадзянскімі актывістамі ў выгнанні, з ключавымі топікамі афіцыйных праграмных дакументаў і праектаў рэформаў, трэба адзначыць, што пераважная большасць праблем і тэматычных топікаў супярэчаць адно аднаму з цалкам зразумелых ідэалагічных і метадалагічных прычын. Найбольш рэзкім і выразным робіцца несупадзенне дыскурсаў, датычных праблем суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі РБ і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі), акадэмічных свабод, ізаляцыі, сек'юрытызацыі і мілітарызацыі адукацыі.

Ёсць і пэўныя супадзенні ў вызначэнні мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі, якія, прынамсі на дэкларацыйным узроўні, у афіцыйным дыскурсе застаюцца арыентаванымі на агульначалавечыя і/або еўрапейскія прынцыпы, убудоўваюцца ў міжнародны кантэкст тэндэнцый і выклікаў (інавацыйнае развіццё, правы чалавека, «грамадства ведаў», канкурэнцыя

за рынкі адукацыйных паслуг і працы і інш.). Пры гэтым у афіцыйным дыскурсе дамінуюць два з трох азначаных незалежнымі экспертамі трэндаў: 1) развіцця рынку працы і прафесійных кампетэнцый і 2) развіцця салідарнасці і грамадзянскіх кампетэнцый (якія, праўда, трактуюцца афіцыйным дыскурсам прынцыпова інакш – у дзяржаўна-цэнтраваным і вайскова-патрыятычным рэчышчы).

У значна меншай меры (і часцей за ўсё зусім фармальна) згадваецца трэці трэнд – развіцця асобы і задавальнення індывідуальных патрэб. У рамках тэмы «мэты, прынцыпы і філасофія адукацыі» найбольшая згода паміж афіцыйным дыскурсам і некаторымі прадстаўнікамі незалежнай экспертнай і грамадзянскай супольнасці існуе адносна эгалітарысцкіх прынцыпаў і «прыярытэту масавай, даступнай і справядлівай адукацыі для ўсіх», якія, з нязначнымі разыходжаннямі ў ступені абгрунтаванасці і радыкалізму, супрацьпастаўляюцца элітарным і мерытакратычным прынцыпам, канкурэнтным і рыначным адносінам.

Нягледзячы на тое, што пераважная большасць праблем і тэматычных топікаў мерапрыемстваў, праграмных дакументаў і праектаў рэформаў незалежных экспертаў і грамадзянскіх актывістаў у выгнанні трапляе ў катэгорыю перасечаных, толькі нязначная частка лейтматываў мерапрыемстваў знайшла сваё адлюстраванне ў праграмных дакументах і праектах рэформаў. Пры гэтым значная частка праектаў не змяшчае канкрэтных дыягностык і прапаноў рэформаў, але абмяжоўваецца фіксацыяй агульных кірункаў і таму можа быць кваліфікавана як палітычныя дакументы.

Практычна цалкам не прадстаўлены на праектным узроўні наступныя топікі: *вызначэнне мэтаў, прынцыпаў і філасофіі адукацыі* (за выключэннем аналітычных дакументаў адносна мэтаў і прынцыпаў ЮНЕСКА і ААН, якія адлюстроўваюць пазіцыю толькі адной групы незалежных экспертаў); *праблема суадносін адукацыі і палітыкі*; *суб'екты адукацыйнай палітыкі*; *праблема суадносін унутранага стану сістэмы адукацыі РБ і міжнароднага кантэксту (глабальных тэндэнцый у адукацыі)*; *ізаляцыя беларускай сістэмы адукацыі ад еўрапейскай прасторы адукацыі і яе асіміляцыя ў адукацыйную прастору РФ*. Гэтыя топікі і пералічаныя хібы недзяржаўных даследаванняў маглі б стаць таксама зонамі росту на найбліжэйшую будучыню.



# 10 найбольш цікавых
# і важных дадзеных

**Дзяржава як манапаліст колькасных даследаванняў не дае ў публічны доступ звестак, неабходных для аналізу дынамікі адукацыйнай сістэмы (дадзеных лангітудных даследаванняў).**

Незалежныя даследчыкі сутыкаюцца з пераследам паводле палітычных прычын.



II

**Дашкольная і дадатковая адукацыя дарослых –** terra incognita для даследчыкаў

**Ахоп дашкольнай адукацыяй у Беларусі** – адзін з найвышэйшых у рэгіёне, амаль **90 %** для дзяцей 1–6 гадоў

**Дадатковай адукацыяй дарослых** у Беларусі ахоплены менш за **15 %** людзей 25–64 гадоў (у Еўропе і ЗША – больш за 50 %)



III

**Беларусь (сама)ізалюецца ад развітых краін свету на ўсіх узроўнях адукацыі. Галоўны бенефіцыяр (сама)ізаляцыі Беларусі – Расійская Федэрацыя.**

Колькасць месцаў паводле квоты ўрада РФ за кошт бюджэту для беларусаў павялічылася з **73** у 2019 г. да **1300** у 2023 г. (яшчэ не менш за **1000** чалавек вучацца платна).

Станам на **сакавік 2023** г. у ВНУ РФ вучацца больш за **12,5 тыс.** грамадзян і грамадзянак Беларусі.



# IV

**Дзяржаўны сектар абсалютна дамінуе на ўсіх узроўнях адукацыі**

## 2022

З **2900** школ – **1** прыватная, у якой вучыліся **280** вучняў (**0,026 %** ад агульнай колькасці)

З **390** установ прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі – **13** прыватных (**3,3 %**), у якіх вучыліся **10,3** тыс. чалавек (**9 %** ад агульнай колькасці)

З **50** установ вышэйшай адукацыі – **8** прыватных (**16 %**), у якіх вучыліся **12 757** чалавек (**5,6 %** ад агульнай колькасці)



на **2900** школ –
**1** прыватная



на **390** установ ПТА –
**13** прыватных



на **50** УВА –
**8** прыватных

# V

**Сістэмная ідэалагізацыя, мілітарызацыя і сек’юрытызацыя адукацыі.**

Са снежня 2020 г. у ВНУ РБ уведзена новая пасада **«сакрэтнага» прарэктара «па бяспецы і кадрах»** з шырокім колам абавязкаў. Пастановай Міністэрства адукацыі ад 15.07.2021 ва ўсіх установах адукацыі (уключна з яслямі-садамі, але за выключэннем пачатковых школ, вячэрніх школ, дапаможных школ, спецыялізаваных ліцэяў) уведзена пасада кіраўніка вайскова-патрыятычнага выхавання.

З 2022 г. пры паступленні ў ВНУ даюцца льготы выпускнікам класаў спартыўна-педагагічнай і вайскова-патрыятычнай накіраванасці, а таксама дзецям вайскоўцаў, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія загінулі (памерлі) або сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў.



# VI

**Абагульнены партрэт беларускай адукацыйнай арганізацыі/ініцыятывы пасля 2020 года:**

паўстала на канкрэтны выклік і запыт мэтавай аўдыторыі; за 3 гады вызначыла і асэнсавала асноўныя мэты і прынцыпы сваёй дзейнасці; працуе лакальна і мала ўдзельнічае ў супольных актыўнасцях; мае павярхоўныя ўяўленні пра змест праектных рэформаў і іх аўтараў; гатовая супольна працаваць, каб вызначыць мэты і прынцыпы беларускай адукацыі, але пры ўмове дэмакратычнай камунікацыі са зваротнай сувяззю; сама не гатовая ініцыяваць абмеркаванне, але гатовая далучыцца на запрашэнне; ініцыятарамі працэсу аб’яднання бачыць Офіс Святланы Ціханоўскай і Каардынацыйную раду.



# VII

**Два падыходы да стварэння праектаў рэформаў недзяржаўнымі актарамі:**

- Поўная/грунтоўная перабудова адукацыйнай сістэмы (Офіс па адукацыі для новай Беларусі, «Беларуская адукацыя на шляху перамен», IDSM, «Новая Беларусь»).

- Некаторыя асобныя змены ў сістэме («За Беларусь», ГБК, Банк ідэй).



# VIII

**Супадзенні і разыходжанні паміж дзяржаўным і недзяржаўным дыскурсамі даследаванняў і рэформаў.**

За апошнія 3 гады назіраецца трэнд усё істотнейшага разыходжання дзяржаўных і неафіцыйных даследаванняў і праграм рэформаў. У фокусе дзяржаўных даследаванняў – якасць адукацыі, праекты рэформаў пры гэтым не прадугледжваюць сістэмных зменаў. У фокусе неафіцыйных даследаванняў – якасць кіравання і функцыянавання адукацыі як сістэмы, праекты рэформаў скіраваны на сістэмныя змены.

**Дзяржаўныя і недзяржаўныя актары супадаюць у скіраванасці на:**

- развіццё рынку працы і прафесійных кампетэнцый;
- эгалітарысцкія прынцыпы рэформаў («прыярытэт масавай, даступнай і справядлівай адукацыі для ўсіх»).

# IX

**Тры зоны росту альтэрнатыўных (недзяржаўных) праектаў рэформаў:**

- засяродзіць увагу на знешняй камунікацыі з патэнцыйнымі спажыўцамі даследчых і праектных матэрыялаў;
- наладзіць каналы зваротнай сувязі са стэйкхолдарамі і прадстаўнікамі шырокага грамадства, наладзіць дыялог паміж усімі зацікаўленымі ўдзельнікамі і ўдзельніцамі адукацыйнага працэсу;
- звярнуць асобную ўвагу на палітычнае вымярэнне, а таксама на мэты і прынцыпы прапанаваных даследаванняў і рэформаў у галіне адукацыі.



# X

**Чатыры зоны росту для недзяржаўных даследаванняў:**

- абагульненне і больш шырокі распаўсюд наяўных даследаванняў (стварэнне каталога адукацыйных даследаванняў, публікацыя ў адзіным месцы даследаванняў, размешчаных на недаступных сайтах і г. д.);
- прыцягненне ўвагі да адукацыйных даследаванняў;
- падрыхтоўка даследчыкаў у адукацыі;
- стварэнне адукацыйнага thinktank'а.